НА ЛАЎЦЫ З ВЯДОМАЙ ЗЯМЛЯЧКАЙ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

5 КАСТРЫЧНІКА 2022 г.
СЕРАДА
№ 195 (29817)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ВАКЦЫНАЦЫЯ СТАРТАВАЛА

12

КАРОТКА

- **Цэнтр «Ветразь» у Пастаўскім раёне першы ў краіне пачаў лячыць дзяцей з ДЦП касмічнымі тэхналогіямі.**
- Комплекс па перапрацоўцы шын пачалі будаваць у Наваполацку.
- **«Белтэлекам» папярэдзіў аб работах у сеткі эфірнага вяшчання 5 і 6 кастрычніка.**
- Міністэрства аховы здароўя скарэкціравала максімальныя гранічныя цэны на некаторыя лекі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Юрый ЧАБАТАР, першы намеснік міністра эканомікі:

«Мы прагназуем аднаўленчую дынаміку ў машынабудаванні, дрэваапрацоўцы, харчовай прамысловасці. Гэтаму садзейнічае ў першую чаргу адаптацыя галін да знешніх умоў дзякуючы росту попыту на нашу прадукцыю на рынках дружалюбных краін, перабудоўванню лагістыкі і пераарыентацыі экспартных патокаў. Нашы ацэнкі пацвярджаюцца вынікамі апытанняў, якія былі праведзены ў верасні НДЭІ Мінэканомікі. Кіраўнікі, у прыватнасці, прагназуюць павелічэнне партфеля заказаў, узроўняў попыту і занятасці, зніжэнне складскіх запасаў. Як вынік, сезонна згладжаны індэкс прамысловага аптымізму дасягнуў сёлета свайго максімуму. Неабходна ў поўнай меры выкарыстаць гэты патэнцыял для замацавання аднаўленчай дынамікі, якая цяпер назіраецца, і далейшага ўстойлівага эканамічнага росту».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«МЭТА НАШЫХ УЗБРОЕНЫХ СІЛ І СІЛАВІКОЎ — АБАРАНІЦЬ НАШУ ЗЯМЛЮ І ДЗЯРЖАВУ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на базе Міністэрства абароны правёў нараду па пытаннях ваеннай бяспекі. На чале з Галоўнакамандуючым кіраўнікі сілавых ведамстваў сумесна прааналізавалі ваенна-палітычную абстаноўку, якая дынамічна развіваецца, і выпрацавалі меры рэагавання на сітуацыю, што складваецца.

Фота Белта.

«Падставы для фэйкаў няма»

«Перш за ўсё хачу сказаць аб тым, што надзвычайшчыны ніякай няма, — падкрэсліў, пачынаючы нараду, кіраўнік дзяржавы. — Таму і падставы для рознага кшталту крыватолкаў і фэйкаў быць не павінна. Сітуацыя абвостраная. Не зніжаецца напружанне спецыяльнай ваеннай аперацыі. Захад актыўна «падлівае масла ў агонь» у выглядзе ваеннай дапамогі і ўсебаковай падтрымкі ўкраінскага рэжыму. Адны заяўляюць аб тым, што хацелі б спыніць вайну, іншыя, наадварот, сваімі канкрэтнымі крокамі дэманструюць працяг гэтай вайны».

Пры гэтым, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, пазіцыя Расійскай Федэрацыі нам абсалютна зразумелая. «Неаднойчы Прэзідэнт (*Расіі*. — **«Зв.»**) аб гэтым заяўляў: яны хоць заўтра гатовыя сесці за стол перагавораў і дамаўляцца, цвяроза зыходзячы з сітуацыі, якая склалася», — паведаміў беларускі лідар. Аднак зацікаўленых у мірных перагаворах на іншым баку няма. «Мы ведаем аб сістэматычных пастаўках Злучанымі Штатамі і іншымі краінамі НАТА праз польскі аэрадром «Жэшуў» узбраенняў і ваеннай тэхнікі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Штодзень туды прыбывае каля дзясятка, часам больш, амерыканскіх транспартных самалётаў. Шэраг еўрапейскіх краін спрабуе паказаць свой удзел у дапамозе ўкраінскай арміі і накіроўвае непатрэбную ім старую тэхніку і зброю — праводзяць так званую ўтылізацыю».

Па словах Прэзідэнта, на міждзяржаўным узроўні гучаць цынічныя выказванні на адрас Расійскай Федэрацыі з боку заходніх палітыкаў. «Я не буду прыводзіць прыклады, вы іх добра ведаеце, — удакладніў беларускі лідар. — Пачынаючы ад канкрэтных заяў канкрэтных дэпутатаў і лідараў, заканчваючы трыбунай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Мэта гэтых дзеянняў зразумелая: Штаты хочуць аслабіць або зусім прыбраць з міжнароднай арэны Расію і яе саюзнікаў, падабрацца бліжэй да свайго галоўнага канкурэнта — Кітая, адначасова ўзмацніць залежнасць Еўрапейскага саюза ад Злучаных Штатаў. Убачыце: калі Еўрасаюз не пойдзе насустрач ЗША, Амерыка яго разбурыць».

СТАР. 2-3

Эксклюзіў

Іван КУБРАКОЎ:

«Міліцыя заўсёды знаходзіцца на перадавой»

Беларусы, як ніхто іншы, ведаюць цану міру і спакою — гісторыя дала добры ўрок. Парадак на вуліцах, пачуццё абароненасці і спакою — адметнасць сучаснага беларускага гарадскога ландшафту. Гэта ў першую чаргу адзначаюць і госці нашай краіны. За парадак у доме, які завецца Беларусь, адказваюць органы ўнутраных спраў.

Ужо больш як 105 гадоў вартавыя правапарадку нясуць сваю службу, стаяць на перадавой барацьбы са злачыннасцю. Як удаецца быць на крок наперадзе зламыснікаў, якія сёння ў большай ступені дзейнічаюць у сферы высокіх тэхналогій, а таксама як развіваецца ведамства з улікам сучасных выклікаў і пагроз, у эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў **міністр унутраных спраў генерал-лейтэнант міліцыі Іван КУБРАКОЎ**. Кіраўнік ведамства падзяліўся: у штодзённым клопаце аб дзеючых супрацоўніках унутраных спраў, які ён трымае на асабістым кантролі, не забываецца і аб будучыні беларускай міліцыі — ужо сёння варта задумацца над дастойнай зменай: калі дзеці і не папоўняць міліцэйскія рады, то ў любым выпадку будуць сумленнымі і прыстойнымі грамадзянамі нашай краіны.

СТАР. 4-5

Удзячная памяць

«МЫ СТАРАЕМСЯ НЕ ЗАБЫВАЦЬ ІХ ПОДЗВІГ»

Гродзенскай школе прысвоена імя казахскага героя Агадзіла Сухамбаева

Адпаведнае пасведчанне было ўручана сёлета падчас урачыстага святкавання Дня народнага адзінства. Шлях да гэтага ў школы быў доўгім. Першым крокам стала прысваенне імя Героя Савецкага Саюза Агадзіла Сухамбаева піянерскай дружыне. Такое рашэнне было прынята пяць гадоў таму, а сёлета атрымана згода казахскіх сваякоў Сухамбаева на прысваенне яго імя і школе.

АД НАЗВЫ ВУЛІЦЫ ДА НАЗВЫ ШКОЛЫ

Сярэдняя школа № 16 — адна са старэйшых у Гродне. У 1960-я гады яна будавалася разам з мікрараёнам, які цяпер ужо знаходзіцца ў цэнтральнай частцы горада. Вераногда, тады адна з вуліц і атрымала назву ў гонар казахскага героя.

— Наша школа адкрыта ў 1965 годзе і знаходзіцца на вуліцы Сухамбаева, — расказала **дырэктар Жанна САЛАМА**. — Гэта стала нагодай даведацца аб яго лёсе і заслугах. Калі паўстала пытанне аб прысваенні школе імя героя, у нас не было сумненняў, хто гэта можа быць.

СТАР. 3

«МЭТА НАШЫХ УЗБРОЕНЫХ СІЛ І СІЛАВІКОЎ — АБАРАНІЦЬ НАШУ ЗЯМЛЮ І ДЗЯРЖАВУ»

«Да Беларусі ў калектыўнага Захаду свае разлікі»

Што датычыцца нашай краіны, то да Беларусі ў калектыўнага Захаду свае разлікі. «Прычым ужо даўно, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Чвэрць стагоддзя ім перашкаджае палітыка, якую мы праводзім. Таму ў Еўропе захоўваецца 35-тысячная групоўка войскаў НАТА, з якой вялікая групоўка — напэўна, тысяч на 25 — у сумежных з Беларуссю краінах. Не зніжаецца інтэнсіўнасць разведвальных палётаў паблізу нашых граніц. Актыўна праводзіцца аператыўная, баявая падрыхтоўка, у тым ліку з задзейнічаннем палігона «Пабрадэ» ў Літве, які знаходзіцца ўсяго за 15 кіламетраў ад Дзяржаўнай граніцы Беларусі».

Адначасова, па словах Галоўнакамандуючага, пад выглядам падтрымкі Кіева шэраг еўрапейскіх краін рэалізоўвае свае планы па пераўзбраенні сучаснымі ўзорамі зброі і тэхнікі, узмацненні сваіх армій. «Найбольшую актыўнасць праяўляе Польшча, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — На поўдні беларускага напрамку адбываецца фарміраванне новай механізаванай дывізіі, на поўначы і ўсходзе краіны ствараюцца кадравыя брыгады тэрытарыяльнай абароны Польшчы. Пашыраецца геаграфія закупак узбраенняў: да традыцыйных ЗША і Германіі дадалася Паўднёвая Карэя».

Замест падтрымкі свайго насельніцтва ў складанай сацыяльна-эканамічнай абстаноўцы ўрад Польшчы плануе павялічыць свой ваенны бюджэт. «Спрабуюць не адставаць у мілітарысцкай гонцы Літва і Латвія, — заўважыў беларускі лідар. — Але ўласных сродкаў няма. Просяць НАТА ўзмацніць прысутнасць на сваіх тэрыторыях за кошт разгортвання на месцах батальённых брыгадных баявых тактычных груп. Пачалі будаўніцтва новых ваенных гарадкоў для іх размяшчэння на пастаяннай аснове, у тым ліку ў непасрэднай блізкасці ад нашай граніцы, за 20 кіламетраў».

«Не трэба чакаць зніжэння напружанасці»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што Літва заявіла аб намерах набыць амерыканскія рэактыўныя сістэмы залпавага агню «Хаймарс». «Навошта яны ім, вайскоўцам, людзям, думаю, тлумачыць не трэба», — заўважыў ён. Па словах Прэзідэнта, Украіна са свайго боку сцягнула да нашай граніцы 15-тысячную групоўку, ажыццяўляе інжынернае абсталяванне блокпастоў і агнявых пазіцый паблізу граніцы, устанавіла загароды на дарожных напрамках. «Словам, не проста забарыкадзіравалася, а пабудавала сцяну», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, паўднёвы сусед пастаянна вядзе аптычную, радыёэлектронную і радыётэхнічную разведку нашай тэрыторыі, войскаў і аб'ектаў. Часта з парушэннем сваімі беспілотнікамі лініі Дзяржаўнай граніцы. «І ў той жа час перажываюць і «парацца» наконт таго, ах, як бы Беларусь не ўступіла ў вайну. І пастаянныя правакацыі на граніцы», — заўважыў Прэзідэнт.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларускі лідар адзначыў, што не прамінулі скарыстацца абвастрэннем сітуацыі і збеглыя. «Мусіць, ужо ад істэрыкі, што іх сталі забываць, прыдумляюць усё больш перакручаныя ідэі. Патрабаванні штуршком да дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі могуць паслужыць узброеныя правакацыі баевікоў з ліку нацысцкіх фарміраванняў. «У такіх умовах мы павінны быць гатовыя да любых варыянтаў абароны, Камітэта дзяржбяспекі: «Сачыце за сваім сапернікам, глядзіце, каб мы не выпусцілі чаго-небудзь. Мы павінны ведаць пра ўсе іх рухі каля Дзяржаўнай граніцы Беларусі. Гэта датычыцца і

Фота Белта.

санкцый супраць Беларусі змяняюцца на заклікі да вайскоўцаў не выконваць і сабатаваць загады камандзіраў, ухіляцца ад прызыву на тэрміновую ваенную службу», — расказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, мэта тая ж, што была і ў 2020 годзе, — разбурыць краіну, звергнуць існуючыя парадкі і лад, разабрацца з кіраўніцтвам дзяржавы. Форма, шлях — узброеныя. Іншыя шляхі ў іх ужо не разглядаюцца. У сувязі з гэтым працягваюць выношваць планы па стварэнні ўласных ваенізаваных фарміраванняў, так званага палка імя Каліноўскага. «Які б «пацешны» гэты полк ні быў, але ў яго складзе ёсць радыкальна настроеныя байцы, якія для дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі могуць пайсці на ўзброеныя правакацыі — перш за ўсё, дыверсійна-падрыўной дзейнасці», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што і на нашай тэрыторыі ёсць затоеныя радыкалы. У 2020—2021 гадах праваахоўнымі органамі асноўныя завадатары беспарадкаў былі выяўлены, але ў іх застаюцца паслядоўнікі, якія чакаюць зручнай пастаўкі для дзеянняў. «Вы бачыце, як «спячыя ячэйкі» праявілі сябе ў Расіі. Трыгерам для дэструктыўных сіл стала важнае рашэнне Прэзідэнта Пуціна аб правядзенні частковай мабілізацыі. Адразу з'явіліся акцыі з «хустачкамі і кветачкамі», пачалі распаўсюджвацца антыдзяржаўныя лозунгі і заклікі да ўхілення ад мабілізацыі. Тыя, хто кішэні набілі пры існуючым рэжыме і палацы, замкі пабудавалі, публічна рвуць пашпарты Расійскай Федэрацыі і бягуць за мяжу. Культурная эліта так званая ў Расіі, аналагічна, як і ў Беларусі ў 2020 годзе, паводзіць сябе, узяла курс на дэстабілізацыю сітуацыі ў Расіі. 2020 год у Беларусі — адзін пад аднаго», — правёў паралель кіраўнік дзяржавы.

Па яго словах, беларускія збеглыя разлічваюць, што падобным развіцця абстаноўкі. У найбліжэйшы час не трэба чакаць зніжэння напружанасці. Наадварот, Расія нарошчвае намаганні ў спецыяльнай ваеннай аперацыі. Захад у сваёй вайне з ёю будзе імкнуцца яшчэ больш узброіць Украіну. Таму мы ў чарговы раз сабраліся тут, каб прааналізаваць развіццё ваенна-палітычнай абстаноўкі вакол Беларусі, вызначыць меры па нашым рэагаванні», — канстатаваў беларускі лідар.

Галоўнакамандуючы расказаў, пра што ўвесь час папярэджвае кіраўнікоў сілавых ведамстваў, — усіх, перш за ўсё Міністэрства пагранічных войскаў, і Мінабароны, і іншых спецслужбаў Беларусі. Як мне дакладваюць, усё пад кантролем. Ну, дзякуй богу!» Аляксандр Лукашэнка таксама пацікавіўся, якія праблемныя пытанні ў сілавых ведамствах набываюць асаблівую вастрыню, прычым не толькі ў плане гарантавання ваеннай бяспекі краіны.

«Хочаш міру — рыхтуйся да вайны»

Прэзідэнт пракаментаваў некаторыя злабадзённыя пытанні. Па яго словах, у апошні час збеглым рабіць няма чаго, казаць няма пра што, парадку дня няма, таму пачынаюць хапацца за рознага кшталту нагоды. У сувязі з гэтым узнікаюць заявы, што калі Расія аб'явіла мабілізацыю — значыць у Беларусі заўтра аб'явяць мабілізацыю. «Яшчэ раз падкрэсліваю, нам няма неабходнасці аб'яўляць мабілізацыю: на шчасце, вайны на тэрыторыі Беларусі няма. Я ўжо некалькі разоў казаў і яшчэ раз падкрэслю. Нядаўна адзін, на бурак падобны, мярзотнік выступаў пад цітрамі: «Лукашэнка рыхтуецца да вайны». Абсалютна дакладна. Колькі я служу Прэзідэнтам, столькі я рыхтуюся да вайны. І не я прыдумаў: калі хочаш міру — рыхтуйся да вайны», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі ўжо як мінімум чатыры разы мадэрнізуюць Узброеныя Сілы, прыстасоўваючы іх да таго становішча, якое складваецца. Па яго словах, перш за ўсё робяцца адпаведныя высновы і выносяцца ўрокі з тых войнаў і канфліктаў, якія адбываліся і адбываюцца на планеце. Пачынаючы ад «Буры ў пустыні» амерыканцаў і заканчваючы спецыяльнай ваеннай аперацыяй ва Украіне. «Мы ўважліва назіраем за ўсімі працэсамі. Што датычыцца нашага ўдзелу ў спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне, мы ўдзельнічаем там, мы гэтага не хаваем. Але мы нікога не забіваем, мы нікуды не дасылаем сваіх ваенных, мы не парушаем свае абавязацельствы. Наш удзел у тым, каб не дапусціць распаўсюджвання гэтага канфлікту на тэрыторыю Беларусі, па-першае. А па-другое, не дапусціць нанясення ўдару па Беларусі пад прыкрыццём спецыяльнай ваеннай аперацыі з боку Польшчы, Літвы і Латвіі. Як я казаў, у спіну рускім страляць ніхто не будзе з тэрыторыі Беларусі. Вось наш удзел», — расставіў акцэнты Аляксандр

У тэму

Рэагаваць хутка, дакладна, адэкватна абстаноўцы

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН падчас свайго даклада адзначыў, што ваенна-палітычная абстаноўка вакол Рэспублікі Беларусь развіваецца пад уплывам беспрэцэдэнтнага геапалітычнага супрацьстаяння паміж Расійскай Федэрацыяй і так званым калектыўным Захадам на чале са Злучанымі Штатамі. «На сутнасці, супраць Расіі развязана поўнамаштабная проксі-вайна, канчатковая мэта якой — разбурэнне расійскай дзяржаўнасці і ператварэнне краіны ў сыравінны прыдатак Захаду», — падкрэсліў міністр.

Пасля нарады кіраўнік абароннага ведамства расказаў журналістам, што былі абмеркаваны тыя магчымыя варыянты, якія могуць узнікаць і пагражаць ваеннай бяспецы нашай краіны, і акрэслены меры рэагавання на такія пагрозы. Абстаноўка сёння складаная. «Ужо адкрыта шэраг варожа настроеных кіраўнікоў у суседніх краінах абазначыў, якіх мэт яны хочуць дасягнуць, працуючы супраць нашай краіны. І проста так без увагі мы гэта пакінуць не можам», — адзначыў Віктар Хрэнін. Міністр абароны падкрэсліў, што на ўсе пагрозы, якія могуць узнікнуць супраць нашай краіны, будуць рэагаваць хутка, дакладна, адэкватна той абстаноўцы, якая будзе ўзнікаць. «Для гэтага ў нас ёсць і сілы, і сродкі», — канстатаваў ён.

Кіраўнік абароннага ведамства заўважыў, што прыкрываючыся ўяўнай «пагрозай з Усходу», краіны НАТА і суседнія з Беларуссю дзяржавы не проста мілітарызуюцца, а рыхтуюцца да вайны. «Рыхтуюць сваю інфраструктуру, рыхтуюць свае войскі. У нас ёсць канкрэтныя даныя. Мы пастаянна адсочваем абстаноўку, бачым, што яны робяць. Выходзячы з гэтага і выпрацоўваем канкрэтныя і адэкватныя меры рэагавання», — сказаў Віктар Хрэнін.

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ адзначыў:

— Ваенна-палітычная абстаноўка сёння мае тэндэнцыю да павышэння напружанасці. І Прэзідэнт як кіраўнік краіны гэтыя пытанні трымае на асабістым кантролі. Ён пастаянна цікавіцца, па-першае, як ацэньваюць вайскоўцы гэтую абстаноўку, якія меры стратэгічнага стрымлівання мы выпрацоўваем, што прадугледжваем для абароны сваёй краіны, свайго насельніцтва, сваіх нацыянальных інтарэсаў. Прэзідэнтам пастаўлена задача — інфармацыю аб абстаноўцы, якая сёння складваецца, давесці да шырокай грамадскасці, да нашага насельніцтва. Народ Беларусі павінен разумець, што сёння адбываецца і чаму такія меры праводзяцца.

Прэзідэнт дакладна і зразумела сказаў: на сённяшні дзень ніякай мабілізацыі ў Беларусі не прадугледжваецца. А той комплекс мабілізацыйных мерапрыемстваў, які праводзіцца, пачаўся не сёння і не ўчора: яны праводзяцца на працягу існавання Узброеных Сіл суверэннай Рэспублікі Беларусь. Комплекс зборавых мерапрыемстваў дазваляе рыхтаваць ваенна навучаны рэзерв, ацэньваць здольнасці дзяржавы ў выпадку неабходнасці мабілізавацца і абараніць сваю Айчыну. Наш народ і так мабілізаваны: ён разумее, што, акрамя нас, насельніцтва Беларусі, ніхто краіну не абароніць. Войны выйграе не армія, а народ, таму народ да абароны сваёй краіны павінен быць заўсёды гатовы.

Лукашэнка. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што Беларусь пастаянна дапамагае пацярпелым ад гэтага канфлікту. «Так, мы лечым людзей, калі трэба. Так, мы кормім людзей, і не толькі расіян. Мы больш кормім тых бежанцаў, бедных небарак, якія па 400-500 чалавек за суткі прыбываюць да нас з Украіны. Як іх не накарміць, як іх не лячыць? Вось такі наш удзел у спецыяльнай ваеннай аперацыі. Іншага няма і не будзе», — канстатаваў Прэзідэнт.

«Гэта для нас урок»

Галоўнакамандуючы звярнуў увагу і на пытанне мабілізацыі, якое цяпер актыўна абмяркоўваюць. У сувязі з гэтым ён папярэдзіў ваенных і праз іх — ваенкаматы. Як толькі ў Расіі аб'явілі мабілізацыю, усе ўбачылі, якія там недахопы. «Не будзем залазіць у сутнасць пытання — гэта справа Расійскай Федэрацыі, як праводзіць мабілізацыю. Але калі разаслалі павесткі, некаторых людзей на месцы не аказалася ў Расіі. Нехта памёр, нехта ўцёк, нехта хворы, незразумела які і гэтак далей. Гэта для нас урок. Таму праз ваенкаматы мы правяралі і будзем правяраць ваенна-абавязаны склад. Усіх ваенна-абавязаных, якія лічацца ў нас у запасе. Трэба ў кожным раёне без гвалту, без шуму», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што трэба акуратна ў кожным раёне паглядзець наяўнасць людзей, удакладніць усе матэрыялы, спісы і дакументы ў ваенкаматах. Па яго словах, розныя могуць быць сітуацыі, і неабходна бачыць, хто на сёння ёсць. «Ніякіх адносін да мабілізацыі гэта не мае. Мы заўжды тое рабілі», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы назваў яшчэ адзін урок, які паказала мабілізацыя ў Расіі. Калі там аб'явілі мабілізацыю, прызывалі людзей, многія з якіх забыліся, што такое зброя. «Таму рэзервістаў, нашы войскі тэрытарыяльнай абароны мы ўвесь час навучалі і будзем навучаць. Яшчэ раз хачу падкрэсліць: кожны, хто павінен і можа трымаць зброю ў руках у Беларусі, павінен умець ёю карыстацца, хоць бы элементарнай. Гэта датычыцца і жанчын, і мужыкоў. Яны павінны асвоіць хоць бы стралковую зброю для таго, каб абараніць, не дай бог, што здарыцца, сваю сям'ю. Мэта нашых Узброеных Сіл і сілавікоў — абараніць нашу зямлю і нашу дзяржаву. Усё! Ніякіх іншых мэт мы сёння не ставім», — заявіў ён. Але, як адзначыў Галоўнакамандуючы, да вайны рыхтуемся, бо ўсякае можа быць.

«Калі б у 2020 годзе тут не выстаялі, пад Смаленскам стаялі б іншыя ўзброеныя сілы. І дзе былі б мы, найперш людзі ў пагонах, адказ доўга шукаць не трэба. Таму вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца, як казаў стваральнік першай нашай дзяржавы. І найперш вучыцца ваеннай справе сапраўдным чынам. Такія лозунгі ў нас заўсёды былі. Вось мы і будзем вучыцца. І не трэба звяртаць увагу на тое, што пра нас скажуць: Ах, мы там пачалі праверку ў нейкім ваенкамаце нашых рэзервістаў. Правяралі і будзем правяраць, але гэта не для таго, каб іх некуды накіроўваць кагосьці забіваць», — сказаў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што не апраўдваецца, але хоча, каб гэта разумелі. Па словах беларускага лідара, калі, крый божа, што здарыцца, за мяжу бегчы ніхто не будзе. «Мы будзем абараняць свой дом і сваю зямлю. Вось і ўсе фэйкі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.

«МЫ СТАРАЕМСЯ НЕ ЗАБЫВАЦЬ ІХ ПОДЗВІГ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Разам з адміністрацыяй і школьнымі актывістамі мы падыходзім да вялікага стэнда на першым паверсе, амаль насупраць увахода. Звяртаю ўвагу на сучаснае афармленне. Педагог арганізатар Таццяна Цыплакова падрабязна каментуе змест — фота Агадзіла, зорка Героя Савецкага Саюза, сямейны фотаздымак, біяграфічныя звесткі, фотакопія ўзнагароднага ліста і газетнага артыкула 1944 года. Прайсці міма стэнда немагчыма, ён адразу кідаецца ў вочы.

На думку педагога, выхаванне патрыётаў пачынаецца са звыклых рэчаў, тых, якія суправаджаюць чалавека ў яго звычайным жыцці. Напрыклад, школьнік, які ідзе па вуліцы Сухамбаева ў школу, павінен ведаць, чаму ў гонар гэтага чалавека назвалі вуліцу.

— Час мяняецца, але галоўныя маральныя каштоўнасці павінны заставацца. Напрыклад, гатоўнасць прыйсці на дапамогу. У гэтым сэнсе прыклад Сухамбаева вельмі яскравы, бо ён прыйшоў на дапамогу таварышам і ўратаваў іх цаной свайго жыцця. І такі прыклад так ці інакш застанецца ў свядомасці школьнікаў, — лічыць Таццяна Цыплакова.

Інфармацыя аб Агадзіле Сухамбаеве захоўваецца і ў піянерскім пакоі. Менавіта адсюль пачалася пошукавая работа.

КАБ ВЕДАЎ КОЖНЫ

Пяць гадоў таму піянерская арганізацыя школы прыняла рашэнне аб прысваенні ёй імя Сухамбаева. Адміністрацыя ўстановы падтрымала ініцыятыву.

— Раней яго імя было на слыху толькі як назва вуліцы. Шырокаму колу нават нашых вучняў ён быў мала вядомы. Сітуацыя змянілася, калі піянерская дружына стала насіць імя героя. Мы даведаліся аб яго подзвігу, а таксама аб тым, што ён удзельнічаў у баях за вызваленне Гродна. Мы расказваем аб гэтым малодшым школьнікам, — паведаміла старшыня савета дружыны Дар'я Лойка.

Пасля таго як дружыне было прысвоена імя Сухамбаева, пачалася пошукавая работа. Вывучалі інтэрнэт-крыніцы, шукалі тэматычную літаратуру, збіралі матэрыял на тэму вайны, у аснову якога быў пакладзены подзвіг Сухамбаева. З ім пазнаёмілі і ўдзельнікаў традыцыйных гарадскіх «Каложскіх чытанняў».

ПОШУК

Перш за ўсё школе трэба было атрымаць дазвол сваякоў Агадзіла. Каб іх адшукаць, установа адукацыі далучылася да міжнароднай эстафеты памяці і ўдзячнасці «Радзіма подзвігу — Радзіме героя». Дзякуючы эстафеце, знайшлі платформу пабраціцтва населеных пунктаў, якія звязвае подзвіг воінаў-вызваліцеляў. З імем Сухамбаева звязана некалькі гарадоў. Па-першае, яго родны Тараз (былы Джамбул) у Казахстане, дзе Агадзіл нарадзіўся. Затым у гэтае кола ўваходзіць беларускі Гродна, які ён вызваляў, польскі Аўгустаў, дзе ён загінуў, і літоўскі Друскінінкай, дзе Сухамбаеў пахаваны. Менавіта праз тую эстафету ўдалося знайсці яго траюраднага пляменніка Адзілкана Суханбаева.

— Аказалася, што сапраўднае прозвішча Агадзіла — Суханбаеў. Памылку зрабілі ва ўзнагародным лісце, і так засталося, — расказала намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Аксана Мікула. — Нават на запісцы ад яго траюраднага пляменніка відаць, што ён потым выправіў літару «н» на «м». Яго сваякі ўсе Суханбаевы. Праўда, звязацца ўдалося толькі з адным, дзякуючы дапамозе мясцовай настаўніцы. Яна паехала ў аул да яго і прывезла запіску, у якой пляменнік дае згоду даць імя дзеда нашай школе. Такі дазвол — абавязковая ўмова пры прысваенні ўласнага імя.

У школы ёсць намер пашырыць зносіны з Казахстанам, радзімай героя: наладзіць перапіску з вучнямі яго роднага горада Тапаз, даведацца, дзе і як вучыўся будучы герой. У Гродне таксама ведаюць аб музеі ў яго роднай школе. У 2005 годзе ў Тапазе адкрыты помнік герою.

— Нам было б цікава больш даведацца аб дзяцінстве Сухамбаева, які ён быў, як вучыўся, пра што марыў. Аб гэтым, магчыма, і маглі б расказаць яго суайчыннікі. А мы, у сваю чаргу, можам расказаць, як ушаноўваем памяць іх земляка. Не толькі ім цікавы яго лёс, але і нам, беларускім школьнікам. Бо недалёка ад гэтых мясцін ён здзейсніў свой гераічны ўчынак, вызваляў Гродна, у якім мы сёння мірна жывём, — заўважыла васьмікласніца Дар'я Мацкевіч.

ПОДЗВІГ

Галоўнае, што ведаюць пра Сухамбаева, тое, што ён паўтарыў подзвіг Аляксандра Матросава.

Адбылося гэта пад польскім Аўгуставаам 31 ліпеня 1944 года. У той дзень камандзір аддзялення Сухамбаеў атрымаў загад ад камандзіра роты прыкрыць агнём пераправу праз рачулку. Наперадзе быў лес, у якім замацаваліся гітлераўцы. Сухамбаеў павёў байцоў у атаку, але пад агнём кулямёта яны вымушаны былі залегчы. Сам камандзір аддзялення схаваўся за дрэва і дастаў гранаты. Першая зачапілася за дрэва і не даляцела да нямецкага дота, а ў гэты момант куля трапіла яму ў руку. Падчас спробы кінуць гранату другой рукой куля прабіла яму локаць. Тады паранены юнак кінуўся на амбразуру, і кулямёт замоўк. Падраздзяленне змагло працягваць наступленне...

Камандзір роты Пётр Карскаў пазней успамінаў: «Калі гэты цяжкі бой заціх, мы знайшлі Агадзіла. Яго цела ляжала на варожым кулямёце. Вечарам усіх байцоў пахавалі ў брацкай магіле. А праз тыдзень паступіў загад аб перапахаванні Сухамбаева ў найбліжэйшым горадзе. Гэта быў Друскінінкай».

Агадзіл выратаваў жыцці не толькі байцоў свайго аддзялення, якім камандаваў, але і многіх іншых з яго роты. Было яму толькі 23 гады. Але да гэтага моманту ён прайшоў дарогамі вайны з восені 1941-га. Літаральна за два тыдні да гібелі браў удзел у вызваленні Гродна. Цікава, што яго аўтамат быў урачыста перададзены найлепшаму байцу, ім стаў беларус Міхаіл Лабацэвіч.

Аб подзвігу маладога казаха ў верасні напісала газета «Красная Звезда». Артыкул выйшаў пад назвай «Бясстрашны сын казахскага народа». А праз некалькі дзён заметка з'явілася ў штодзённай чырвонаармейскай газеце «На ворага». Аб гераічным подзвігу паэт Глотаў склаў баладу, якая была надрукавана ў баявым лісце.

У сакавіку 1945 года Агадзілу Сухамбаеву было прысвоена імя Героя Савецкага Саюза.

ПРЫКЛАД ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

— Такія людзі — сапраўдныя патрыёты, інакш яны не ахвяравалі б сабой, бо па загадзе немагчыма быць героем, — лічыць васьмікласніца Кіра Іванова. — Наўрад ці дзеля геройства яны тое рабілі, а каб абараніць сваю зямлю, сваіх таварышаў, з якімі ваявалі. Каб на гэтай зямлі працягваўся род тых, хто тут жыў спрадвеку, каб яе не завяваў вораг. І мы стараемся не забываць іх подзвіг.

— Спадзяюся, што будзе больш помнікаў героям і тым, хто ўнёс значны ўклад у гісторыю нашай зямлі. Гледзячы на іх прыклад сённяшняе пакаленне натхняецца больш рабіць для сваёй Радзімы, развіваць яе, — выказвае сваё меркаванне Дар'я Лойка.

У школе надаецца важнае значэнне патрыятычнаму выхаванню, расказала Аксана Мікула. Напрыклад, летась тут запусцілі вэб-сайт, які называецца «Рэха вайны ў піянерскіх сэрцах». Створана віртуальная экскурсія «Гродзеншчына ў гады вайны ў імёнах», турыстычны маршрут «Жыві і помні», штогод у піянерскай дружыне праходзіць збор, прысвечаны Сухамбаеву. Дарэчы, экспазіцыя аб казахскім героі сабрана і ў музеі суседняга са школай прафесійна-тэхнічнага каледжа бытавога абслугоўвання. На абодвух будынках ёсць мемарыяльныя шыльды ў яго гонар.

Маргарыта Ушкевіч. Фота аўтара і СШ г. Гродна № 16.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Times: НАТА папярэдзіла саюзнікаў аб магчымых ядзерных выпрабаваннях Расіі ў Чорным моры

НАТА папярэдзіла краіны — членаў блока, што Расія можа правесці ядзерныя выпрабаванні ў Чорным моры, такім чынам яна прадэманструе гатоўнасць прымяніць зброю масавага паражэння. Пра гэта паведамляе The Times са спасылкай на высокапастаўленую крыніцу ў сферы абароны.

Паводле яго слоў, у Паўночнаатлантычным альянсе ўпэўненыя, што сцэнарый правядзення выпрабаванняў у Чорным моры больш верагодны, чым прымяненне тактычнай ядзернай зброі ва Украіне.

Нягледзячы на тое, што і другі сцэнарый «не выключаны», ён спалучаны з буйнымі рызыкамі, у тым ліку для самой Расіі, бо ў выпадку памылкі могуць пацярпець многія гарады краіны, піша Times.

Раней у МЗС РФ заявілі, што ваенная падтрымка Захадам Украіны пагражае сутыкненнем ядзерных дзяржаў. 21 верасня, аб'яўляючы аб пачатку частковай мабілізацыі, прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін папярэдзіў, што ружа вятроў можа павярнуцца ў бок тых, хто «вядзе ядзерны шантаж супраць РФ». Заяву Пуціна на Захадзе ўспрынялі як пагрозу, што прывяло да шэрага вострых палітычных выказванняў. Былы дырэктар ЦРУ Дэвід Петрэус выказаў меркаванне, што ЗША знішчаць расійскія войскі і Чарнаморскі флот, калі Расія прыменіць ядзерную зброю.

Жыхары прыгарада Санта-Барбары не жадаюць суседнічаць з Меган Маркл і прынцам Гары

Жыхары ваколіц амерыканскага горада Санта-Барбара выказаліся супраць пераезду ў іх мясцовасць Меган Маркл і прынца Гары. Пра гэта паведамляе TMZ.

У пачатку кастрычніка з'явілася інфармацыя аб тым, што Меган Маркл і прынц Гары плануюць пераезд унутры штата Каліфорнія ў ЗША. Паведамлялася, што герцаг і герцагіня Сасекскія, якія пражываюць у Мантэсіта, збіраюцца пасяліцца ў раёне ранча Хоўп у прыгарадзе Санта-Барбары. Аднак новым суседзям тут, мяркуючы па ўсім, не радыя.

Па даных TMZ, члены Асацыяцыі домаўладальнікаў Санта-Барбары хоць і не адчуваюць непрыязнасці да герцага і герцагіні Сасекскіх, але турбуюцца, што іх пераезд выкліча шэраг праблем. Яны баяцца, што да ранча Хоўп будзе прыкавана занадта шмат увагі прэсы, і гэта, у сваю чаргу, прымусіць нерваваць мясцовых жыхароў. Акрамя таго, яны баяцца ўзнікнення заторaў на дарогах, якія і без таго вузкія і звілістыя.

«Міліцыя заўсёды

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Іван Уладзіміравіч, у Год гістарычнай памяці Міністэрства ўнутраных спраў актыўна ўключылася ў работу па захаванні памяці аб тых, хто загінуў, абараняючы нашу зямлю, у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вы святa шануеце подзвіг супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, якія маюць дачыненне да гераічнага мінулага нашай краіны, аб чым сведчаць шматлікія патрыятычныя праекты ведамства. Чаму сёння нельга заставацца абыякавымі да падзей 80-гадовай даўнасці?

— Заставацца абыякавымі да подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны нельга нікому, ніводнаму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь. У нашай краіне гэта немагчыма, бо амаль у кожнай сям'і ёсць родныя людзі, якія загінулі ў той страшнай вайне. Што датычыцца супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і таго, што мы ўключыліся ў гэтую работу, скажу шчыра — яна ніколі не спынялася. У Год гістарычнай памяці праводзяцца больш значныя, масавыя акцыі, у якіх удзельнічае вялікая колькасць нашых супрацоўнікаў. Мы шануем памяць нашых калег незалежна ад таго, калі яны загінулі. Міліцыя заўсёды знаходзіцца на перадавой. У гады Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнікі ў ліку першых адстойвалі незалежнасць. Цяпер — стаяць на перадавой барацьбы са злачыннасцю. На жаль, мы губляем людзей у мірны час. Згодна з законам, нашы супрацоўнікі маюць права ахвяраваць сабой дзеля выратавання іншага чалавека. Аднак у нас няма жывых і мёртвых — у нас усе ў страі. І тыя супрацоўнікі, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў, заўсёды з намі. Міліцыя — такое ведамства, дзе ёсць асаблівы карпаратыўны дух. Любы супрацоўнік, які прыходзіць у органы ўнутраных спраў, пасведчанне і табельную зброю атрымлівае ў памятным месцы: або каля помніка супрацоўнікам органаў унутраных спраў і ваенаслужачым унутраных войскаў МУС, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку, або каля помніка загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Для нас жыццёва неабходна памятаць і шанаваць калег, дзядоў і прадзедаў, якія абаранялі нашу Радзіму. Калі мы забудзем гэты подзвіг, то грош нам цана. Не можа быць выхавання патрыёта без памяці аб гэтым подзвігу.

— У кожнай беларускай сям'і, за рэдкім выключэннем, ёсць тыя, хто ўнёс уклад у Вялікую Перамогу. На франтах Вялікай Айчыннай з ворагам змагаўся і адзін з вашых дзядоў, другі загінуў падчас савецка-фінскай вайны. Як памяць аб іх захоўваецца ў вашай сям'і?

— У маёй сям'і ў розных войнах удзельнічалі тры чалавекі. Мой дзядуля, Кубракоў Цімафей Ягоравіч, загінуў у 1940 годзе падчас савецка-фінскай вайны. Яна была нядоўгай, але Савецкі Саюз страціў у ёй каля 130 тысяч чалавек. Мой дзед браў непасрэдны ўдзел у баявых дзеяннях. Заставаўся роўна месяц да яе заканчэння, як ён ад ран памёр у шпіталі. Другі дзядуля, Лызікаў Сямён Елізаравіч, загінуў у 1944 годзе, вызваляючы Украіну ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта адбылося практычна на парозе вызвалення Мінска... Пахаваны ён у вёсцы Лебядзін або Лебядзіно на той момант Кіеўскай вобласці. Я аб гэтым даведаўся толькі тры-чатыры гады таму. Інфармацыю знайшлі ў архівах, там было пазначана, дзе знаходзіцца брацкая магіла. На жаль, у сувязі з падзеямі ва Украіне так і не змог пабываць на яго магіле. Імёны абодвух дзядуль занесены на мемарыял у горадзе Касцюковічы, дзе адзначаны мае землякі, якія загінулі за нашу Радзіму. Ужо ў сучаснай вайне ўдзельнічаў мой брат, які выконваў свой інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан. Дзякуй богу, вярнуўся жывы і здаровы, аднак таксама прайшоў праз пекла вайны. У нашай сям'і выхоўваюць дзяцей, асабліва сыноў, у духу патрыятызму і гераізму: калі запатрабавала абстаноўка, усе сталі на абарону Радзімы. Невыпадкова 9 Мая для нас — сапраўднае свята, якое адзначаецца ў абавязковым парадку.

— Толькі выхоўваючы падрастаючае пакаленне на гераічным мінулым, можна быць спакойнымі за будучыню нашых дзяцей...

— Вельмі часта даводзіцца чуць — і гэта адбываецца з пакалення ў пакаленне — фразы накшталт «цяпер іншая моладзь» або «моладзь ужо не тая». Некаторыя кажуць, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны маладыя людзі сталі на абарону Радзімы, а цяпер моладзь выхоўваецца ўжо па-іншаму. Аднак забываюцца пра тое, што выхаванне моладзі — у нашых руках, у руках дарослых людзей, у тым ліку прадстаўнікоў органаў унутраных спраў. Ідэалогія павінна быць адна — гэта патрыятызм, і мы заўсёды займаліся дадзеным пытаннем. Аднак пасля 2020 года вывелі яго на абсалютна іншы ўзровень. Многія скардзяцца, што немагчыма дзіця выцягнуць з інтэрнэту. Няпраўда! Калі пачынаеш з дзецьмі працаваць, заўважаеш, што вельмі шмат хлопцаў, як і раней, марыць стаць вайскоўцамі, хочуць служыць у органах унутраных спраў. Ім трэба расказваць, для чаго гэта трэба, і тлумачыць, што не проста так сёння на нашых вуліцах парадак і спакой. Варта расказаць і аб тым, што адбываецца па-за нашымі граніцамі, і што гэта таксама не само сабой узнікла. І самае галоўнае, важна данесці сучаснай моладзі — калі мы будзем патрыётамі, будзем імкнуцца ўмацоўваць нашу Радзіму, то ніхто нават не асмеліцца тузануцца ў наш бок, бо будуць ведаць, што мы заўсёды абаронім сваю краіну.

— Ці апраўдалі сябе ваенна-патрыятычныя клубы, створаныя на базе часцей унутраных войскаў?

— Калі мы пачалі займацца патрыятычнымі клубамі, то не чакалі такога ажыятажу. Планавалася стварыць патрыятычны клуб у Мінску пры вайсковай часці 3214 — гэта наш спецназ. Меркавалі, што ў сталіцы атрымаецца дакладна. Аднак як толькі пачалі гэтым пытаннем займацца, адразу практычна з усіх адміністрацый раёнаў пачалі паступаць прапановы: чаму б не стварыць падобныя клубы ў Полацку, Наваполацку, дзе ў нас ёсць вайсковыя часці ўнутраных войскаў, у іншых населеных пунктах, дзе няма воінскіх часцей, але ёсць органы ўнутраных спраў? Адначасова стала паступаць вельмі шмат просьбаў ад бацькоў, якія хацелі запісаць туды сваіх дзяцей. Нядаўна з просьбай дапамагчы ў стварэнні патрыятычнага клуба да нас звярнулася адміністрацыя Касцюковіцкага раёна, адкуль я родам. У горадзе няма воінскай часці, гэта ўскраіна нашай краіны, але і там узнікла неабходнасць у такой форме ваенна-патрыятычнага выхавання. Спачатку гаворка ішла пра 20 дзяцей, сёння там займаецца каля 50 хлопчыкаў і дзяўчынак. Думаю, гэта яшчэ не мяжа. Наведваць такія клубы дзецям цікава: хтосьці займаецца спортам, хтосьці хоча навучыцца трапна страляць. Мы ведаем і іншыя прыклады, калі дзяцей вучыць вуліца. Таму ў такой форме работы зацікаўленыя як дзеці, так і бацькі. На бягучы момант у патрыятычных клубах займаецца каля 1800 непаўналетніх. Сярод іх — вялікая колькасць дзяўчынак. Я ганаруся тым, што ў нас расце такое пакаленне. Нас падтрымлівае Прэзідэнцкі спартыўны клуб, які аказвае дапамогу ў набыцці спартыўнага інвентару для дзяцей, за што мы вельмі ўдзячныя. Усе разам мы выхоўваем сапраўдных патрыётаў нашай краіны.

— Магчыма, у перспектыве многія з гэтых дзяцей папоўняць міліцэйскія рады...

— Безумоўна, мы зацікаўленыя ў гэтым. Ваенна-патрыятычныя клубы — адна з сістэм падрыхтоўкі будучых міліцыянераў. Будучых абаронцаў правапарадку мы выхоўваем і ў Спецыялізаваным ліцэі Міністэрства ўнутраных спраў. Там вучацца хлопцы з 7 да 11 класа. Потым яны, як правіла, паступаюць або ў Акадэмію МУС, або ў Магілёўскі інстытут МУС. З ранняга ўзросту мы ўкладваем у гэтых дзяцей паняцце сапраўднага абаронца правапарадку, якога мы потым хочам бачыць у асобе міліцыянера. Хлопчыкі паступаюць у ліцэй з вялікім задавальненнем. Супрацоўнікі міліцыі расказваюць, што іх дзеці, якія там вучацца, чакаюць заканчэння канікулаў, каб хутчэй вярнуцца ў ліцэй. Там шыкоўны басейн, спартыўная пляцоўка. Ёсць магчымасць не толькі займацца спортам, а ўсебакова развівацца: у абавязковым парадку навучэнцы наведваюць памятныя месцы нашай краіны, музеі, культурныя мерапрыемствы. У выхаванцаў па некалькі камплектаў формы адзення — мы поўнасцю забяспечваем нашых дзяцей. Сёлета быў немалы конкурс. Тут заўсёды хоча вучыцца больш юнакоў, чым можа прыняць навучальная ўстанова. У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць стварыць яшчэ адзін ліцэй МУС. Цяпер праводзіцца апытанне грамадскага меркавання, дзе ён будзе найбольш запатрабаваны.

— Злачыннасць сёння не стаіць на месцы. Усё больш супрацьпраўных дзеянняў здзяйсняецца ў сферы інфармацыйных тэхналогій. Аднак не стаіць на месцы і міліцыя. Наколькі аператыўна супрацоўнікі органаў унутраных спраў адсочваюць новыя павевы ў злачыннай дзейнасці і што дапамагае рэагаваць на іх?

— Зламыснікі шукаюць такія варыянты, каб можна было здзяйсняць супрацьпраўнае дзеянне і не несці за яго адказнасць. Аднак недарэмна супрацоўнікаў міліцыі мы вучым так, каб яны заўсёды былі на крок наперадзе злачынцаў. Пакуль апошнія яшчэ не падумалі аб тым, як будуць парушаць закон, мы ўжо павінны ведаць, як будзем супрацьдзейнічаць, прафілактаваць, а самае галоўнае, калі адбудзецца злачынства, яго спыняць і, натуральна, раскрываць. Сапраўды, сёння злачыннасць, асабліва што датычыцца махлярства, дзесьці ў 80 % сышла ў інтэрнэт. Мы аналізуем усе віды злачынстваў, якія здзяйсняюцца, у тым ліку ў сферы інфармацыйных тэхналогій. Дарэчы, мы адны з першых у СНД пачалі займацца гэтай работай. Менавіта ў Рэспубліцы Беларусь былі створаны першыя падраздзяленні па супрацьдзеянні кіберзлачынствам. На цяперашні момант гэта ўжо сфарміраваная структура. Наш вопыт перайманюць у многіх краінах, асабліва ў краінах Садружнасці. Навучанне супрацоўнікаў — адно з найбольш важных пытанняў. У Акадэміі МУС створана кафедра, дзе праходзяць і перападрыхтоўку, і навучанне будучыя спецыялісты ў згаданай сферы. Калі на працягу апошніх пяці гадоў у нас быў пад'ём дадзеных злачынстваў, то ўжо ў канцы 2021 года наступіў пераломны момант, калі, наадварот, мы бачым зніжэнне злачынстваў, якія адбываюцца ў сферы высокіх тэхналогій. Адным словам, міліцыя не стаіць на месцы.

— Апошнім часам зламыснікі выманьваюць у людзей грошы па стацыянарным тэлефоне...

— Тэлефоннае махлярства, так званае «Ало, мама!», — гэта вельмі прадуманая схема. Злачынцы тэлефануюць грамадзянам ад імя праваахоўных органаў і кажуць, што іх сваяк трапіў у бяду, з мэтай вырашэння сітуацыі просяць аддаць грошы. На жаль, нягледзячы на работу, якая праводзіцца (мы ў яе ўключыліся адразу), колькасць тых, хто перадае махлярам вялікія сумы, павялічваецца. Хачу яшчэ раз давесці да тых, хто асабліва пражывае адзін: не кідайцеся ў вір з галавой, а пераправерце інфармацыю. Дастаткова набраць тэлефон «102» і паведаміць, што да вас звярнуліся. Калі злачынцы тэлефануюць, яны кажуць, што ўсё павінна быць канфідэнцыяльна, бо калі грамадзяне аб гэтым камусьці раскажуць, будзе бяда. Не трэба верыць і паддавацца на такія хітрыкі. Што датычыцца гэтага віду злачынстваў, супрацоўнікі дастаткова паспяхова супрацьстаяць яму. Аднак міліцыя працуе ўжо тады, калі нашы даверлівыя грамадзяне аддаюць грошы. Мы знаходзім, затрымліваем (працэнт раскрывальнасці адзначанага віду злачынства — звыш 80 %), аднак іх можна ўвогуле пазбегнуць, калі нашы грамадзяне стануць больш пільнымі.

Хачу адзначыць і работу нашых сышчыкаў. Якія б злачынствы ні адбываліся, яны заўсёды даходзяць да ісціны і знаходзяць зламысніка. Кажучы аб тых, хто хаваецца ад следства, на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь мала хто прыязджае, бо ведаюць, калі да нас трапляе запыт ад калег, мы вельмі старанна адпрацоўваем і знаходзім гэтых людзей на нашай тэрыторыі. Мы імкнёмся працаваць на апярэджанне, каб не дапусціць здзяйснення злачынства. Аднак калі яно адбываецца, дзейнічаем прафесійна. Згадайце 2019 год, калі адбываліся нападзенні на катэджы. Рэзанансным стала рабаванне ювелірнай крамы «Яхант». Група зламыснікаў, якая здзяйсняла злачынствы на тэрыторыі Мінска, была вельмі дзёрзкая, падрыхтаваная — практычна не пакідала слядоў. Аднак менавіта дзякуючы нашым сышчыкам, дзякуючы згуртаванасці калектываў крымінальнага вышуку іх знайшлі. Увогуле я заўсёды захапляюся гэтымі хлоп-

знаходзіцца на перадавой»

цамі: калі яны пачынаюць працаваць па злачынстве, для іх не існуе часу ў сутках. Яны адданыя сваёй справе і днём, і ноччу. Хацеў бы падзякаваць супрацоўнікам крымінальнага вышуку, у якіх сёння свята *(5 кастрычніка адзначаецца Дзень крымінальнага вышуку. — «Зв».)*, а таксама іх родным і блізкім, бо калі здараюцца рэзанансныя злачынствы, сем'і не бачаць іх дома па некалькі дзён.

— Прафесія міліцыянера заўсёды была спалучаная з рызыкай. Наколькі абароненыя сёння вартавыя правапарадку?

— Абароненасць супрацоўнікаў міліцыі — пытанне нумар адзін. Яно заўсёды знаходзіцца ў мяне на кантролі. Так, раскрыццё злачынстваў — гэта важна. Аднак не будзе ні раскрыцця, ні прафілактыкі, калі супрацоўнікі міліцыі не будуць упэўненыя ў сваёй абароненасці. Кожны міліцыянер, які ідзе на работу, асабліва гэта датычыцца практычных падраздзяленняў, тых жа ўчастковых інспектараў, не ведае, што яго чакае. Нямала прыкладаў, калі звычайны выклік аб сямейным скандале заканчваецца гібеллю альбо атрыманнем цялесных пашкоджанняў супрацоўнікам органаў унутраных спраў. Такія выпадкі мы аналізуем і робім усё для таго, каб нашы супрацоўнікі былі прафесійна падрыхтаваныя, здольныя прыняць правільнае рашэнне ў экстрэмальнай сітуацыі. 2020 год — напэўна, у сучаснай Беларусі гэта адзін з найбольш яркіх прыкладаў таго, калі ў адносінах да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, іх сем'яў ажыццяўляўся беспрэцэдэнтны ціск. Спрабавалі паліць маёмасць міліцыянераў, пагражалі дзецям, жонкам. Не дапусціць больш падобнага — такая задача пастаўлена нашай службе ўласнай бяспекі, якая падпарадкоўваецца асабіста міністру ўнутраных спраў. Любую пагрозу здароўю або жыццю супрацоўніка міліцыі я адразу ж бяру на кантроль. На жаль, шмат выпадкаў супраціўлення, непадпарадкавання супрацоўнікам органаў унутраных спраў. Згодна з унесенымі змяненнямі ў Крымінальны кодэкс, павялічана адказнасць за супраціўленне міліцыі — гэтыя злачынствы ўжо адносяцца да катэгорыі цяжкіх.

Што датычыцца ў цэлым клопату аб нашых супрацоўніках, цяпер на абсалютна іншы ўзровень мы падымаем нашу ведамасную медыцыну. У кожным рэгіёне ёсць паліклініка МУС. Шпіталь МУС — толькі рэспубліканскага ўзроўню. Узнікла неабходнасць стварыць месцы дзённага стацыянара для лячэння менавіта ў рэгіёнах. Нягледзячы на немалыя грошы, гэта патрэбна. Служба ў міліцыі звязана з вялікай нагрузкай, напружаннем, таму актуальныя пытанні і ў сферы прафілактыкі захворванняў супрацоўнікаў. Гэтаму мы аддаём асаблівую ўвагу: набываем новае медыцынскае абсталяванне, ствараем камфортныя ўмовы ў медыцынскіх установах, клапоцімся аб рэабілітацыі.

— Клапоціцеся вы і аб тым, каб у кожнага супрацоўніка органаў унутраных спраў быў свой дах над галавой. Жыллёвае пытанне — адно з найбольш важных у жыцці чалавека. Наколькі хутка яно вырашаецца для міліцыянераў?

— У рэгіёнах у нас практычна адсутнічае чарга на жыллё. Хачу падзякаваць усім старшыням абл-выканкамаў, Мінгарвыканкама, якія заўсёды ідуць насустрач на вылучэнні арэнднага жылля, інтэрнатаў для міліцыянераў. Што датычыцца будаўніцтва, мы не стаім на месцы. Калі ёсць такая неабходнасць, я непасрэдна звяртаюся да кіраўніка дзяржавы, які нас заўсёды падтрымлівае. Вядома, жыллёвае пытанне існуе. Усім хацелася б прыходзіць у міліцыю і адразу атрымліваць кватэру, але перш трэба папрацаваць. Я ў свой час таксама жыў у інтэрнаце, потым у «маласямейцы» — гэта загартоўвае. Потым больш цэніш сваё жыллё. Што датычыцца арэндных кватэр, такія катэгорыі супрацоўнікаў, як патрульна-паставая служба, атрады міліцыі асаблівага прызначэння, забяспечваюцца ім у першую чаргу. Робім усё для таго, каб у прадстаўнікоў практычных падраздзяленняў клопат аб жыллі сыходзіў на другі план. Сярод міліцэйскіх сем'яў нямала шматдзетных. Яны таксама забяспечваюцца жыллём у ліку першых. Клопат пра калектыў — у прыярытэце. Калі прызначаецца кіраўнік на пасаду, асабліва начальніка РАУС, я заўсёды засяроджваю на гэтым увагу. Калі супрацоўнікі не будуць адчуваць падтрымку, не варта чакаць і вынікаў работы.

— Міністр унутраных спраў заўсёды на сувязі з народам, аб чым сведчаць вашы шматлікія паездкі па краіне...

— Імкнуся раз у тыдзень наведваць адзін з райаддзелаў. Калі вы'язджаю ў рэгіён, абавязкова сустракаюся з супрацоўнікамі, прашу, каб на такія сустрэчы, калі ёсць пэўныя пытанні, прыходзілі і члены іх сем'яў. Дапамога родным і блізкім супрацоўнікаў органаў унутраных спраў знаходзіцца на асабістым кантролі. Для міліцыянераў у мяне прыёмнага часу няма — таксама дзверы заўсёды адчыненыя для членаў іх сем'яў, ветэранаў. Звяртаюцца з рознымі пытаннямі. Напрыклад, у кагосьці муж пастаянна на службе і хочацца, каб дзіця хадзіла ў садок ці школу побач з домам. Усё вырашаецца. Нават бытавыя пытанні трымаюцца на кантролі: пачынаючы ад начальніка раённага аддзела ўнутраных спраў, заканчваючы міністрам. Апошні ліст паступіў ад мамы хлопчыка, жонкі нашага супрацоўніка. Я чалавек несентыментальны, але на слязу прабіла. У іх расце сын, яму пяць гадоў, дзень нараджэння хлопчыка прыпадае на Дзень крымінальнага вышуку. Яго мама напісала, што сын хоча быць міліцыянерам. Хлопчык перагледзеў усе ролікі з удзелам міністра, АМАПа, на дзень нараджэння хоча падарунак — наведаць атрад міліцыі асабліва прызначэння, пракаціцца на спецмашыне «ЗУБР» і пабываць у кабінеце міністра. Мы не маглі адмовіць, таму сёння ў нас будзе вельмі добры госць. Ён марыць стаць міліцыянерам, а мы ўсё для гэтага зробім.

— Абстаноўка ў свеце сёння неспакойная. Наколькі з улікам сучасных выклікаў і пагроз удасканальваецца ведамства?

— Мы добра разумеем, бачым, адсочваем тое, што адбываецца за межамі нашых граніц. У сувязі з апошнімі падзеямі даводзіцца вывучаць вопыт калег краін СНД. Дарэчы, і праваахоўнікі з розных краін вельмі ўдзячныя нам. Яны прыязджалі ў Беларусь пасля падзей 2020 года. У выніку многія рэчы прымянялі ў сваёй дзейнасці пры забеспячэнні аховы грамадскага парадку. Заўсёды кажу сабе, што 2020 год не буду ўспамінаць, але гэта немагчыма, і мы, напэўна, павінны яго памятаць: ён многаму нас навучыў, мы зрабілі пэўныя высновы.

Што датычыцца развіцця ведамства, мы ні на імгненне не спыняемся. Людзі заўважаюць міліцыянераў, якія нясуць службу па ахове грамадскага парадку, раскрываюць злачынствы, працуюць у пашпартна-візавай службе, ДАІ. Аднак вялікі масіў нашай дзейнасці — аператыўная, прафілактычная работа — схаваны ад вачэй. Як і пастаянна падрыхтоўка праваахоўнікаў да дзеянняў у асаблівых умовах. Дзень і ноч яны трэніруюцца — нездарма кажуць, што порах трэба трымаць сухім. Мы павінны быць у пастаяннай баявой гатоўнасці. Калі ў нас на тэрыторыі ўсё добра і спакойна, гэта не значыць, што міліцыянеры павінны расслабіцца. Супрацоўнікі ведамства ў любы момант гатовыя супрацьстаяць сучасным выклікам і пагрозам. І калі хтосьці, не дай бог, задумае зладзіць масавыя беспарадкі або, горш за тое, здзейсніць пэўныя супрацьпраўныя дзеянні, нашы падраздзяленні абавязкова забяспечаць ахову грамадскага парадку і бяспеку грамадзян. Удасканальванне ведамства ідзе па ўсіх кірунках: пачынаючы аб клопаце аб супрацоўніках унутраных спраў, заканчваючы іх экіпіроўкай, форменным абмундзіраваннем, спецсродкамі, тэхнічнымі сродкамі, закупкамі тэхнікі. Развіццё ідзе пастаянна.

— І дазвольце, крыху аб асабістым. У народзе кажуць: дрэнны той салдат, які не марыць стаць афіцэрам. Як пачынаўся ваш афіцэрскі шлях і хто паўплываў на прафесійны выбар?

— У першую чаргу, да работы ў органах унутраных спраў мяне падштурхнула выхаванне маіх бацькоў. Яны былі вельмі простымі людзьмі і часта паўтаралі — ніколі не трэба быць абыякавым да чужой бяды. Гэта праяўлялася ва ўсім, нават у дробязях. Я бачыў, як бацькі адносіліся да жыцця. Сыгралі сваю ролю і аповеды мамы аб яе бацьку, маім дзядулі, якога яна ніколі не бачыла. У міліцыі служыў мой старэйшы брат — дзесьці паўплываў і яго прыклад. Прыклад таго ж участковага, які прыязджаў у вёску, дзе я нарадзіўся. Тыя, хто жыў у Савецкім Саюзе, мы ўсе выхоўваліся на адных і тых жа фільмах, патрыятызм быў у кожным з іх. Для мяне застаюцца любімымі фільмы «Месца сустрэчы змяніць нельга», «Пятроўка, 38», «Агарова, 6», «Афіцэры». Адным словам, стаць міліцыянерам марыў са школы. Адразу паступіць у Магілёўскую школу міліцыі, на жаль, не атрымалася. Аднак пасля службы ва ўнутраных войсках я пайшоў працаваць у міліцыю. Пачынаў з Цэнтральнага РАУС Мінска, потым стаў рухацца далей — усё атрымалася. Калі заканчваў Мінскую спецыяльную сярэднюю школу міліцыі (потым ужо паступіў у Акадэмію МУС), нават не думаў, што так будзе. Меркаваў, што калі стану намеснікам начальніка раённага аддзела міліцыі, будзе вельмі добра. А яно вось як выйшла. Не трэба баяцца марыць, заўсёды варта ісці да сваёй мэты.

— Міліцэйская прафесія вам вядомая з самых нізоў. Ці сумуеце па тым часе, калі былі звычайным міліцыянерам?

— Я вельмі ўдзячны лёсу, што давялося працаваць участковым інспектарам міліцыі. Гэта выдатная школа жыцця, кузня кадраў. У 2001 годзе я быў прызначаны на пасаду ўчастковага інспектара міліцыі. Уяўляеце, якая тады эканамічная абстаноўка была, шмат здзяйснялася злачынстваў — больш, чым цяпер. Участковыя — тыя міліцыянеры, якія бліжэй за ўсіх знаходзяцца да людзей, таму, калі нешта здараецца, людзі звяртаюцца ў першую чаргу да іх. Калі ўчастковы інспектар працуе з душой, то і на ўчастку будзе парадак. Людзі прыходзяць да мяне на прыём і расказваюць, што памятаюць участковага інспектара міліцыі Кубракова. Гэта прыемна. Імкнуся і цяпер ад практыкі не адрывацца. У любы час сутак, асабліва калі адбываюцца рэзанансныя злачынствы, працуючы і начальнікам УУС, і ГУУС, і ўжо будучы міністрам, заўсёды выязджаю на здарэнне. Пры прызначэнні начальніка любога райаддзела, імкнуся асабіста з ім пагутарыць, удакладніць, якія ёсць пытанні, праблемы. Дзе б не працаваў кіраўнік, ён павінен заўважаць простых міліцыянераў, якія выконваюць асноўную задачу.

— Напэўна, для кожнага чалавека ў пагонах важна, каб яго дынастыя мела працяг. Вам ёсць кім ганарыцца?

— Вядома! Сынам, які пачынаў службу з крымінальнага вышуку, цяпер працуе ў адным з міліцэйскіх падраздзяленняў Мінска. Нягледзячы на тую нагрузку, якую бачыў мой сын, маю пастаянную адсутнасць дома, ён сам прыняў рашэнне служыць, я ні ў якім разе на гэта не ўплываў. Ён планаваў паступаць у БДУ, а потым рэзка задаў пытанне, як прайсці камісію і куды звярнацца, каб прайсці іспыты ў Акадэмію МУС. Прызнаюся, я быў вельмі задаволены. Ганаруся сынам, што ён прыняў такое рашэнне. Рады, што не расце «сынком міністра». Так, ён мой сын, але выконвае тыя задачы, якія яму ставяцца, і ніколі — я адсочваю гэта вельмі жорстка — не прыкрываецца пасадай бацькі. Яму падабаецца працаваць у міліцыі, і я гэта бачу. Буду рады, калі ў яго ўсё атрымаецца, і жадаю, каб рухаўся толькі наперад. Гэта добра, калі дзеці ідуць па шляху сваіх бацькоў і гатовыя абараняць сваю Радзіму, што б ні адбывалася.

— Служыць Радзіме — гэта сапраўды прызванне? Ці можна гэтаму навучыць?

— Многае залежыць ад бацькоў, іх выхавання. Мы бачым, што адбываецца ў свеце. Калі абыякава адносіцца да патрыятызму, не адстойваць свае правы, не абараняць Радзіму, мы ведаем, чым усё можа скончыцца. Безумоўна, прымусіць любіць Айчыну немагчыма, але кожнаму чалавеку неабходна растлумачыць, для чаго гэта трэба. Растлумачыць на прыкладах гісторыі, якую забываць нельга. Важна памятаць, чым ахвяравалі нашы людзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — самым дарагім. Яны добра разумелі, што сілы няроўныя, але стаялі да канца, стаялі насмерць. Ахвяраваўшы сабой, яны далі магчымасць жыць нам, будучым пакаленням. На такіх прыкладах мы і павінны выхоўваць будучую моладзь. У нас усё будзе добра пры ўмове, што наша грамадства будзе адзіным цэлым, гатовым у любы момант, калі спатрэбіцца (вядома, мы не павінны гэтага дапусціць), стаць на абарону нашай Радзімы.

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МУС.

Дзейныя асобы

ХТОСЬЦІ РАТАВАЎ ЛЮДЗЕЙ І МАЁМАСЦЬ, А ХТОСЬЦІ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ ДАКУМЕНТЫ...

Трапіўшы летам на Мядзельшчыну, на сваю малую радзіму, наведала краязнаўчы музей. Мяне там цікавіла ўсё, што датычылася Лук'янавічаў і Брусоў — родных вёсак маіх таты і мамы. Бачачы лічбы — колькі там спаленых хат, колькі загінулых у агні людзей, чытаючы іх прозвішчы, каторы раз адчула, наколькі важная справа — захаваць архівы, дакументальную крыніцу інфармацыі! І тады ж міжволі прыгадала гамяльчанку, Ганаровага архівіста Рэспублікі Беларусь Таццяну Іванаўну Адамовіч.

...Спачатку, як выглядала, лёс выпісаў ёй пуцёўку ў паштавікі, потым — у чыгуначнікі: восем гадоў Таццяна жыла ў Бураціі, скончыла чыгуначны тэхнікум. Але ж потым прыехала ў Беларусь, у Рэчыцу, па накіраванні гаркама камсамола стала захавальніцай фонду ў занальным дзяржаўным архіве.

Усё там давялося асвойваць з нуля, што добра — пад кантролем і з дапамогай сапраўдных спецыялістаў. Гісторык-архівіст Аляксандра Пяндзюрына адразу ж ацаніла рэдкую працавітасць новенькай, яе надзвычайную акуратнасць і абавязковасць. А таму не дзіва, што з цягам часу Таццяна стала малодшым навуковым супрацоўнікам, архівістам і нават... дырэктарам, за што потым у думках не раз дакарала сябе: навошта ўзялася? Не жаночая гэта справа! Да таго ж у будынку, які патрабаваў неадкладнага капітальнага рамонту...

Адступаць — гэта не з яе характарам. З яе — аператыўна і на добрым узроўні арганізаваць работу, заслужыць падзяку ад Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Саўміне краіны, стаць членам калегіі архіўнага аддзела Гомельскага аблвыканкама, паступіць на завочнае аддзяленне ў Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут.

Набытыя веды і, вядома ж, вопыт ёй вельмі спатрэбіліся пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

— Нехта рататаваў людзей, маёмасць, жывёлу, а мы, — успамінае Таццяна Адамовіч, — дакументы жыхароў Брагінскага, Хойніцкага і Лоеўскага раёнаў. Адсяленне, ліквідацыя гаспадарак, збор і вываз дакументацыі... Шмат што неабходна было зберагчы, захаваць, каб у будучыні дапамагаць палешукам аднаўляць працоўны стаж і іншыя факты біяграфій. Мы не лічыліся з часам, ахвяравалі здароўем...

Гэта і сапраўды, бо Таццяна Іванаўна сама, як і многія тады, захварэла, перанесла аперацыю, але ж вярнулася на працу і зноў пайшла на павышэнне — стала начальнікам архіўнага аддзела аблвыканкама.

— Тагачасны губернатар Аляксандр Грахоўскі пры назначэнні папярэдзіў, што праблем будзе шмат, — успамінае Таццяна Іванаўна. — І сапраўды: будынкі асобных архіваў знаходзіліся ў аварыйным стане, а дакументы ж захоўваць трэба. Такая была задача, і аднекуль з'яўляліся сілы, каб яе вырашаць. За два гады мы ўвялі будынак архіва ў Мазыры, потым зрабілі прыбудову да філіяла ў Жлобіне, не абышлі ўвагай і родную Рэчыцу...

Нямала складанасцяў узнікала ў рабоце з кадрамі, а найбольш — з далучэннем былога партархіва Гомельскага абкама КПБ, пасля чаго фактычна быў створаны Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў вобласці. І сёння 22 архівы па асабовым складзе, сфарміраваныя яшчэ ў 1999—2000 гадах, функцыянуюць, захоўваюць важныя для грамадства і грамадзян дакументы. (Згадаем, што 90-я гады мінулага стагоддзя былі часам стварэння і ліквідацыі розных кааператываў, існавала пагроза захаванню неацэнных архіваў арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці.)

У 1999-м Галоўны архіў Рэспублікі Беларусь паставіў задачу аднавіць у краіне гербы і сцягі. У рэгіёне адказнасць за справу ўсклалі на архіўны аддзел аблвыканкама. У выніку ў 2001-м адноўлены 32 гербы і сцягі гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, створаны герб і сцяг Гомельскай вобласці. Па ўспамінах Таццяны Іванаўны, ім вельмі дапамагалі тады прадстаўнікі органаў улады, шчырая зацікаўленасць намесніка старшыні аблвыканкама Валерыя Ахлесціна, рэкамендацыі гісторыка, спецыяліста па геральдыцы галоўархіва краіны Сяргея Рассадзіна.

...Без спраў, без клопатаў не засталася Таццяна Іванаўна і на заслужаным адпачынку: узначаліла раённую Чыгуначную (г. Гомель) ветэранскую арганізацыю. З таго часу і да сёння яна клапоціцца пра легендарных людзей, шмат робіць для таго, каб моладзь магла пачуць іх.

Мне пашчасціла сустракацца з многімі падапечнымі Таццяны Іванаўны. У памяці — як наведвалі былога лётчыка-штурмавіка Сцяпана Аляксандравіча Лысенку, як слухалі маналогі блакадніцы Ленінграда Наталлі Іванаўны Карась, разведчыка Алега Назаравіча Пліндова ды іншых...

Алег Назаравіч, напрыклад, у даваенным Магілёве бачыў Якуба Коласа, на фронце вёў дзённікі сваіх баёў і запісваў вершы, сустракаўся з Аляксандрам Твардоўскім. Больш за тое, нядаўна амаль стогадовы ветэран выступіў перад маладымі архівістамі і на гэтай вось сустрэчы ад імя людзей свайго пакалення шчыра падзякаваў Таццяне Адамовіч за яе ўклад у архіўную справу.

...Ведаю, што яна ўжо здала ўласныя документы ў архіў па асабістым саставе. Аднак ад спраў паранейшаму не адышла: спяшаецца то на навукова-гістарычную канферэнцыю, то на ўрок мужнасці, то павіншаваць кагосьці з днём нараджэння.

— Люблю людзей залатога ўзросту, — прызнаецца яна, не заўважаючы, як той самы ўзрост наступае ў самой.

Тамара Кручэнка,
г. Гомель.

Весткі з месцаў

ДА ВЕТЭРАНАЎ... З ПАКЛОНАМ

Перад святамі, Днём настаўніка, Днём пажылых людзей, выхаванцы нашага сацыяльнага прытулку наведалі былых супрацоўнікаў, уручылі ім букеты восеньскіх кветак і паштоўкі.

Ветэраны былі рады пабачыць дзяцей, пагутарыць з імі, пачаставаць цукеркамі. У выніку добрыя ўспаміны пра свята засталіся і ў былых педагогаў, і ў выхаванцаў.

Ларыса Татарынава,
дырэктар Смаргонскага сацыяльнага педагагічнага цэнтра.

Усмешачку!

І НЕ ПАСПРАЧАЕШСЯ!

Наша ўнучка ў свае няпоўныя сем гадкоў ходзіць не толькі ў першы клас, але і на танцы, на музыку, у басейн...

Вось гэта, апошняе, ёй падабаецца больш за ўсё! Ну яшчэ б: нейкі месяц заняткаў, а ўжо столькі зрухаў.

— Мама, я ўмею плаваць кролікам! — пахвалілася надоечы.

— Не кролікам, дачушка, а кролем... Так называецца гэты від плавання.

— Дык ён у дарослых — кроль, а ў дзяцей — кролік.

Ёсць логіка!

А. Войцік, *г. Гродна.*

Гістарычная памяць

БЕЗ МЕЖ І БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

Гэта гісторыя не пра мяне асабіста ці пра маіх родных. Гэта гісторыя пра людзей розных нацыянальнасцяў і ўзростаў, людзей, якія захоўваюць, памятаюць і ганарацца летапісам сваёй сям'і. Гэта гісторыя пра Радзіму маю — Беларусь, адкрытую і сардэчную, пра беларусаў, якія аддаюць свой час на пошукі зусім незнаёмых людзей праз больш як 75 гадоў пасля заканчэння вайны.

Калі я была ў снежні мінулага года ў Маскве на канферэнцыі ў МПДУ, выпадкова пазнаёмілася з дарослым ужо чалавекам — Вячаславам з Грузіі, які больш за дваццаць гадоў жыве ў расійскай сталіцы. Даведаўшыся, што я з Беларусі, ён расказаў мне сваю гісторыю.

Доўгія гады Вячаслаў шукае інфармацыю аб сваім дзядулі — армяніне па нацыянальнасці, Ірыцяне Татэвасе Нікагосавічы, які ў лютаўскі дзень 1942 года разам са сваімі двума братамі пайшоў на фронт з далёкай грузінскай вёскі Тотхам. Кожны з іх пакінуў дома сям'ю і дзяцей. Пайшоў і не вярнуўся, знік без вестак. Апытанні родных, знойдзеная інфармацыя ў інтэрнэце дазволілі Вячаславу зрабіць выснову, што дзядуля загінуў у Беларусі. А потым работа і іншыя клопаты на пэўны час спынілі пошукі. Але ніколі яго не пакідала думка знайсці хоць якую-небудзь інфармацыю аб дзядулі дзеля захавання гісторыі сваёй сям'і, дзеля сваіх дзяцей. І наша сустрэча стала новым этапам у яго пошуках.

Рыхтуючыся ў студзені гэтага года да 57-га Зорнага паходу па месцах баявой і працоўнай славы, які праходзіць у БДПУ з 1966 года, тут, у Беларусі, я згадала гэту гісторыю і Вячаслава — армянскага хлопца з Грузіі, які пражывае ў Расіі. Чатыры краіны, чатыры розныя пакаленні, адна гісторыя, адзін боль і адна памяць на ўсіх.

Я пачала шукаць дзядулю зусім незнаёмага мне чалавека ў знак падзякі за жыццё маё і маіх дзяцей, у знак прызнання грузінскаму, армянскаму, рускаму і іншым народам за магчымасць ствараць. Вячаслаў працягвае пошукі і сёння. Ён спадзяецца. Яму адказваюць: «Спісы абнаўляюцца». Праз 76 гадоў ніхто не забыты, нішто не забытае. Мы памятаем, мы ганарымся. Бо да гэтага часу ёсць людзі, якія вядуць праект «Мемарыял» — банк даных аб абаронцах Айчыны, якія загінулі, памерлі і зніклі без вестак у перыяд Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд, абнаўляюць аўтаматызаваны банк даных «Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь», ажыццяўляюць праект «Пошук сваіх» і ствараюць новыя праекты, такія, як «Дарога Памяці» і многія іншыя.

У працэсе пошукаў мне, як і Вячаславу, сустрэліся неабыякавыя людзі, якія жывуць у Беларусі. Дзякуючы карпатлівай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ўпраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, Фонду развіцця і падтрымкі армянознаўчых даследаванняў «АНІВ» у выдавецтве «Беларуская навука» выйшла навукова-мемарыяльнае выданне «Воіны-армяне ў баях за Беларусь (1941—1944 гг.)». У дадзеным унікальным выданні на 155-й старонцы мы знайшлі імёны дзядулі Вячаслава — Ірыцяна Татэваса Нікагосавіча і яго брата — Ірыцяна Матэваса Нікагосавіча, якія цяпер назаўжды застануцца ў памяці тых, хто жыве.

Сёння гэтая кніга знаходзіцца і ў музеі Армянскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Х. Абаяна. Яе падарылі беларускія студэнты БДПУ магістрантам армянскага ўніверсітэта ў Слуцку — у дні 57-га Зорнага паходу па месцах баявой і працоўнай славы каля мемарыяльнага помніка воінам-інтэрнацыяналістам.

З асаблівай пашанай, гонарам і падзякай мне хочацца назваць імёны людзей, якія адгукнуліся на мае звароты і лісты Вячаслава, людзей, якія сустракаліся са мной і выдаткоўвалі свой час, дарылі часцінку сваёй душы. Сярод іх генерал-маёр Андрэй Валяр'янавіч Бурдыка, намеснік міністра абароны па тыле — начальнік тылу Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь; Сяргей Мікалаевіч Варановіч і Алена Гаральдаўна Вольская — прадстаўнікі ўпраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл, Армэн Хечаян — дырэктар Фонду развіцця і падтрымкі армяназнаўчых даследаванняў «АНІВ», сям'я Марозавых — аўтары праекта «Цаной жыцця» ды многія іншыя.

Гэта людзі рознага рангу і ўзросту, але з вялікімі сэрцамі. Я ганаруся, што ўсе яны пражываюць у маёй краіне. У Беларусі, якая шануе кожнага, хто аддаў жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У краіне, у якой да гэтага часу вядуцца палявыя пошукавыя работы асабовым складам спецыялізаваннай воінскай часці сумесна з грамадскімі пошукавымі аб'яднаннямі, вызначаюцца памятныя месцы пахаванняў ахвяр генацыду беларускага народа і баявой славы, вядуцца работы па пошуку астанкаў воінаў і іх перапахаванні ў добраўпарадкаваныя месцы. Нізкі паклон усім, хто аддаў сваё жыццё падчас Вялікай Айчыннай вайны. Вялікая падзяка тым, хто і сёння прыкладвае работу па ўвекавечанні імёнаў воінаў-герояў.

Гэта гісторыя не пра мяне асабіста ці пра маіх родных. Гэта гісторыя пра людзей розных нацыянальнасцяў і ўзростаў, гісторыя аб захаванні гістарычнай памяці і гонару за краіну, аб павазе і пашане да подзвігу народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гісторыя пра каштоўнасці, на якіх мы выхоўваем сваіх дзяцей, каштоўнасці, важныя для кожнага беларуса. Таму што яны, як і гістарычная памяць на Радзіме маёй — Беларусі, без меж і без тэрміну даўнасці.

Святлана КАБАЧЭЎСКАЯ,
дэкан факультэта эстэтычнай адукацыі БДПУ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
5 кастрычніка 2022 г. № 38 (674)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

З ЛЮДЗЬМІ І ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ

Звярнуўшыся да сенатараў па дапамогу, жыхары розных рэгіёнаў сапраўды яе атрымліваюць

Фота зробленыя падчас прыёмаў, якія члены Савета Рэспублікі праводзілі ў розных рэгіёнах.

Фота БелТА.

СЁННЯ ў Мінскай вобласці члены Савета Рэспублікі праводзяць адзіны дзень прыёму грамадзян. Парламентарыі наведаюць усе раёны Міншчыны, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць іх просьбы, прапановы і скаргі, па магчымасці пасадзейнічаюць у вырашэнні хвалюючых пытанняў.

Правядзенне падобных сустрэч ужо стала для верхняй палаты парламента добрай традыцыяй. Падобныя адзіныя дні прыёму сёлета прайшлі ў Гомельскай, Віцебскай, Магілёўскай абласцях і даказалі сваю эфектыўнасць. Сенатары не толькі дапамагаюць людзям у вырашэнні надзённых пытанняў і праблем, але і атрымліваюць зваротную сувязь, бачаць усё на месцах, даведваюцца, чым рэальна жыве той ці іншы населены пункт або рэгіён. Менавіта з гэтым веданнем улада мае права і падставы звацца сапраўды народнай.

Работа з людзьмі на месцах, са зваротамі грамадзян — адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці Савета Рэспублікі. Гэта неаднойчы падкрэслівала і кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента. У прыватнасці, выступаючы на адкрыцці цяперашняй, дзясятай сесіі Наталля КАЧАНАВА адзначыла: *«Мы нясём адказнасць за забеспячэнне якасці жыцця насельніцтва, за ўзровень і тэмпы развіцця ўсіх рэгіёнаў нашай краіны і за тое, як грамадзяне ставяцца да ўлады і сваёй дзяржавы.*

Відавочна, што Беларусь у спакоі не пакінуць. Замежныя палітыканы і празітуючыя за іх кошт збеглыя працягваюць будаваць адыёзныя сцэнарыі па дэстабілізацыі грамадска-палітычнай сітуацыі ў Беларусі. Галоўная мэта заходніх паліттэхнолагаў — гэта нашы людзі. Найбольш хвалюючыя для насельніцтва тэмы, нават, здавалася б, самыя малазначныя бытавыя праблемы — гэта поле, на якім яны спрабуюць фарміраваць свой дэструктыўны парадак дня.

Таму нам расслабляцца і самазаспакойвацца ніяк нельга. Трэба жыць жыццём людзей, быць заўсёды з імі, падстаўляць плячо ў цяжкай сітуацыі. Кожны член Савета Рэспублікі павінен мець распісаную «карту праблемных пытанняў» свайго рэгіёна, якая дазваляе не толькі хутка і адэкватна рэагаваць на сацыяльную незадаволенасць, але, што яшчэ важней, — папярэджваць яе прычыны.

Не трэба чакаць, каб людзі ішлі да вас, — трэба самім ісці ў народ. Формы работы з насельніцтвам могуць і павінны быць самымі рознымі — гэта асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з працоўнымі калектывамі і грамадзянамі па месцы жыхарства, удзел у інфармацыйна-прапагандысцкіх групах, дыялогавых пляцоўках, выступленні ў сродках масавай інфармацыі. Важна не столькі, якую форму прымяняць, колькі тое, як яе прымяняць: трэба працаваць з людзьмі так, каб яны хацелі мець зносіны з вамі».

У гэтым нумары мы сабралі некалькі рэальных гісторый рэальных людзей, якія звярнуліся па дапамогу і атрымалі яе. Як той казаў, блізкая ўлада ў дзеянні.

❍ Дарэчы

У Савет Рэспублікі за студзень — жнівень гэтага года паступіла каля 4,4 тысячы зваротаў. У бягучым годзе сенатарамі праведзена каля 300 прамых тэлефонных ліній, звыш 500 асабістых прыёмаў грамадзян, больш за 1,3 тысячы сустрэч з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

У цэнтры ўвагі — СМІ, бяспека і палітычная асвета

Расказваем пра навіны тыдня з Савета Рэспублікі

● Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са старшынёй закрытага акцыянернага таварыства «Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «Мір» Радзікам Батыршыным. Як адзначыла Наталля Качанава, сёння кампанія «Мір» — адзін з самых папулярных і аўтарытэтных сродкаў масавай інфармацыі на еўразійскім кантыненце. Падчас сустрэчы абмеркаваныя пытанні ўзаемадзеяння СМІ з дзяржаўнымі органамі і напаўнення інфармацыйнай прасторы якасным кантэнтам. Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала міждзяржаўную тэлерадыёкампанію «Мір», а таксама прадстаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь з 30-годдзем з дня заснавання.

sovrep.gov.by

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (ПА АДКБ) Ігар ГЕДЗІЧ узяў удзел у рабочай нарадзе па пытаннях узгаднення праектаў мадэльных актаў АДКБ. Гэтыя акты ўносяцца на разгляд пастаянных камісій ПА АДКБ. Разгледжана 10 праектаў мадэльных заканадаўчых актаў. Экспертаў і распрацоўшчыкаў мадэльных заканадаўчых актаў азнаёмілі з заўвагамі і прапановамі па ўдасканаленні прапанаваных праектаў.

● Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Савета ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Валерый ГАЙДУКЕВІЧ узяў удзел ва ўрачыстым сходзе і канцэрце з нагоды 30-годдзя з дня ўтварэння Беларускага саюза афіцэраў. Сенатар зачытаў прывітанне ад імя Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай. «Служэнне Радзіме — высокі гонар і вялікая адказнасць. Вашы самаадданасць, вернасць афіцэрскаму і грамадзянскаму абавязку, гатоўнасць да работы ў самых складаных умовах садзейнічаюць умацаванню нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь», — гаворыцца ў пасланні.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня РГА «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ узяў удзел у тэматычным адукацыйным семінары «Кіраванне працэсамі развіцця грамадзянскай супольнасці». Былі разгледжаныя актуальныя пытанні, якія знаходзяцца ў цэнтры ўвагі кіраўнікоў пярвічных арганізацый. «Важны кірунак нашай работы на сучасным этапе — фарміраванне палітычнай свядомасці і палітычнай культуры. Менавіта таму мы робім акцэнт на палітычнай асвеце і палітычнай рабоце», — адзначыў Алег Раманаў.

Валерыя СЦЯЦКО.

ПАСЛЯ РАЗМОВЫ Ў ВАЛЯР'ЯНАВЕ

Як фермерам з Вілейскага раёна дапамагла сустрэча на прысталічным рынку

РАКШЫЦЫ — невялікая вёска ў Вілейскім раёне, далёкая ад бойкіх шляхоў. Ціхая, утульная. Сяльчане тут вядуць няспешны рытм жыцця. Вакол прыгожыя краявіды, чыстае паветра.

— Я родам з Маладзечна, бабуля жыве ў вёсцы Язні, адтуль і мой муж. Там мы пазнаёміліся, пабраліся шлюбам і вырашылі пераехаць бліжэй да прыроды ў суседнія Ракшыцы і заняцца асабістай падсобнай гаспадаркай, — распавяла фермер Марына Язневіч. — Так і зрабілі. Цяпер у нас дзевяць кароў, цяляты, набылі прадукцыйнага быка.

У Марыны і Генадзя Язневічаў сем гектараў зямлі. Зручна, што ўчастак знаходзіцца непадалёку ад дома — не трэба ганяць статак на пашу за некалькі кіламетраў. Але гэтай плошчы замала для таго, каб нарыхтаваць кармоў з запасам для рагуль на зіму.

У Марыны Ігараўны на фермерскім рынку Валяр'янава, што пад Мінскам, ёсць пункт для гандлю малочнымі прадуктамі — вяршкамі, тварагом, малаком, маслам, рознымі відамі сыру, якія робіць сама гаспадыня. Вучылася жанчына сыраробнай справе па інтэрнэце, збірала даўнейшыя рэцэпты ў старэйшых людзей. Не ўсё атрымлівалася адразу, часта выходзіў брак, які даводзілася скармліваць свінням. Але з цягам часу Марына набіралася вопыту, удасканальвала майстэрства. Спачатку частавала самаробнымі прадуктамі сваякоў, знаёмых, блізкіх. Затым лішкі прадукцыі, калі на падворку пабудавалі невялікі цэх па перапрацоўцы сыравіны, пачала прадаваць на рынку. З'явіліся і пастаянныя пакупнікі — людзі ацанілі якасць прадуктаў.

Фота Бел ТА.

Наталля КАЧАНАВА падчас наведвання фермерскага рынку Валяр'янава цікавілася ў людзей іхнімі праблемамі.

— На пачатку жніўня Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава наведала рынак, пагутарыла з фермерамі, уладальнікамі асабістых падсобных гаспадарак наконт таго, чаго ім не хапае, якія праблемы хвалююць. Падышла Наталля Іванаўна і да мяне. Яна расказала, што ў размове з ёй адзін з фермераў сказаў, што яму не хапае зямлі для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. І пацікавілася, як ідуць справы. Я пацвердзіла на асабістым прыкладзе, што гэта сапраўды так, зямлі не хапае, і звярнулася з просьбай пасадзейнічаць у выдзяленні дадатковага зямельнага ўчастка, каб можна было вырошчваць больш кармоў для жывёлы, павялічваць вытворчасць малочнай прадукцыі. У той жа дзень мне патэлефанавалі і сказалі, што ўзялі пытанне на кантроль. Затым яшчэ раз пацікавіліся, як яно вырашаецца, — падзялілася са мной Марына Язневіч.

Сям'і фермераў былі прапанаваны для разгляду зямельныя ўчасткі, якія могуць быць прыдатныя для назапашвання сена і выпасу жывёлы з фонду земляў вёскі Забалоцце Ільянскага сельсавета. Дадаткова ім прапанавана разгледзець магчымасці стварэння сялянскай (фермерскай) гаспадаркі і варыянты зямельных участкаў.

— Практычна да нашага ўчастка прымыкае надзел у восем гектараў зямлі, якія належаць сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву (СВК) «ЮНІК-Агра» дзяржаўнага прадпрыемства «Малочны гасцінец». Я звярнулася да старшыні сельгасарганізацыі з просьбай выдзеліць дадатковую плошчу ў арэнду. Мы знайшлі з ім паразуменне, трэба толькі афарміць неабходныя дакументы, — кажа Марына Язневіч. — Вельмі ўдзячная Наталлі Іванаўне. Гэта чалавек, які ўважліва ставіцца да патрэб людзей. Яна разумее, што фермеры шмат працуюць, цэніць працу кожнага з іх.

Як адзначыла Марына Ігараўна, сапраўды, фермерам даводзіцца працаваць без выхадных, без адпачынку. За лета ўдалося толькі два разы на возера выбрацца з дзеткамі. А іх у сям'і трое. Яны вучацца ў Мацькаўскім дзіцячым садзе — базавай школе, якая знаходзіцца ад Ракшыц за пятнаццаць кіламетраў. Лізавета вучыцца ў дзявятым класе, Марта — у шостым, а малодшы Дамір пакуль дзетсадавец. Кожны дзень іх на заняткі забірае школьны аўтобус і прывозіць назад пасля ўрокаў. Але вучэбную ўстанову плануюць закрыць, а вучняў перавесці ў Сцешыцкі дзіцячы сад — сярэднюю школу.

— А не ўзнікала пытанне пераехаць бліжэй да цывілізацыі, у райцэнтр? — пацікавілася ў сваёй суразмоўніцы. — Дзецям было б зручней хадзіць у школу?

— Затое яны жывуць на свежым паветры, харчуюцца якаснымі хатнімі прадуктамі, асабліва любяць «малочку». Вядома, па меры магчымасці дапамагаюць прыбрацца ў хаце, нешта прыгатаваць. Але нагружаць іх фермерскімі клопатамі пакуль рана. Падчас гарачых сезонных работ наймаем людзей.

Сямейная пара паступова развівае сваю гаспадарку. Перш за ўсё спадзяецца на ўласныя сілы. Гадоў пяць таму купілі старэнькі трактар, Генадзь замяніў у ім усё начынне. Сёлета набылі не новы, праўда, але большай магутнасці, з неабходнымі сельскагаспадарчымі прыстасаваннямі. Мужу таксама давялося шмат папрацаваць, каб давесці яго да ладу. Новы хлеў для жывёлы таксама патрэбны. «Будаўніцтва за кошт крэдыту для нас непад'ёмнае. Калі зменім статус на сялянска-фермерскую гаспадарку, стане магчымым узяць лес для будоўлі, — плануюць гаспадары.— У падсобную гаспадарку мы ўклалі шмат сродкаў, прыкіпелі да яе душой. Будзем паступова расці, пашырацца, усё ў нас атрымаецца».

Як кажуць, пад ляжачы камень вада не цячэ, трэба варушыцца, не расслабляцца. Сям'я Язневічаў паказвае асабістым прыкладам, што і ў глыбінцы можна добра жыць і працаваць. Асабліва калі знаходзіш разуменне і падтрымку.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

КАБ ВАДА — НЕ БЯДА, А ДАРОГА — НЕ ТРЫВОГА

Жыхары Светлагоршчыны ішлі на прыём не з асабістымі — з калектыўнымі праблемамі

ЗВАРОТ да парламентарыя застаецца адным з самых запатрабаваных спосабаў пошуку вырашэння хвалюючых пытанняў у людзей. Некалькі прыкладаў, калі пасля агучвання праблемы на самым высокім узроўні набалелае вырашаецца, прыводзяць у Светлагорскім раёне. Мясцовыя жыхары ў час правядзення адзінага дня прыёму грамадзян у Гомельскай вобласці членамі Савета Рэспублікі шукалі дапамогі ў вырашэнні праблем, якія ўплываюць на якасць жыцця не адной сям'і. Водгук на звароты не прымусіў сябе чакаць.

Сёння ў вёсцы Карпавічы Асташкавіцкага сельсавета, што на Светлагоршчыне, пастаянна пражываюць крыху менш за 30 чалавек. У 12 дварах — уласныя свідравіны для водазабеспячэння, на вясковых вуліцах — пяць студняў агульнага карыстання, але бяруць ваду людзі толькі з трох. Адзін з калодзежаў знаходзіцца побач з домаўладаннем Алы Казловай. Пенсіянерку, якая пераехала ў Карпавічы і пасялілася ў бацькоўскім доме, хвалявала праблема даступнасці і якасці пітной вады ў вёсцы. Адпаведны зварот і адрасавала жанчына Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай падчас асабістага прыёму, які спікер верхняй палаты парламента праводзіла ў Светлагорску. Звярнулася да парламентарыя мясцовая жыхарка таксама з просьбай разабрацца ў спрэчнай сітуацыі, якая ўзнікла з-за таго самага калодзежа, што на мяжы дамоў заяўніцы і яе суседкі.

— Сёння пытанне заяўніцы аб доступе да студні на вуліцы вырашана. Сіламі мясцовай гаспадаркі ААТ «Асташкавічы» перад зімовым сезонам таксама праверана работа водазабornай калонкі каля дома Алы Казловай, — адзначыў **старшыня Асташкавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Ігар МАНЬКО.**

Між тым, каб увогуле вырашыць праблему чыстай вады для вяскоўцаў, быў праведзены цэлы комплекс работ: ремонт і ачыстка воданапорнай вежы, прамываннe сетак водазабеспячэння, замена глыбіннай помпы, ремонт водазабornай калонкі, звяртае ўвагу Ігар Манько. Сёння нараканняў на праблему з вадой ад жыхароў Карпавіч не паступае.

Ала КАЗЛОВА на прыёме ў Наталлі КАЧАНАВАЙ.

— Зрабілі калонку, праехалі па вуліцах Лясной, Рамязоўскага, праглядзелі, больш людзі не скардзяцца. Увесь час вадой карыстаюся, каб усе так пытанні вырашаліся, — расказала нам сама жанчына, якая ўзняла праблему.

Добрыя водгукі на дапамогу ў вырашэнні сваіх зваротаў агучвае і Валянціна Шарыпава. Жыхарка Светлагорска на прыём да Наталлі Качанавай прыйшла з асабістым пытаннем. Валянціна Іванаўна шукала дапамогі, каб канчаткова разабрацца ў гісторыі трагічнай гібелі ў ДТЗ яе пляменніка.

— На прыёме не змагла стрымацца, моцна плакала, — падзялілася Валянціна Шарыпава. — Наталля Іванаўна паставілася да мяне вельмі душэўна. Вялікі ёй дзякую, што ўважліва выслухала мяне, падтрымала ў маім пытанні. Я ёй вельмі-вельмі ўдзячная.

Пасля звароту па асабістым пытанні жыхарка райцэнтра таксама агучыла дарожную праблему, якая хвалюе не адно сямейства не толькі светлагорцаў, але і жыхароў раёна.

Падчас рамонту дарогі па вуліцы Лазо светлагорскія дарожнікі цалкам аднавілі каля васьмі тысяч «квадратаў» праезнай часткі.

— Узняла пытанне па дарозе ў Светачы, каля 9-й школы, таксама расказала пра стан дарогі па вуліцы Школьнай у вёсцы Прудок і ў Ельнічках, — тлумачыць заяўніца.

Пасля агучвання хвалюючай праблемы ў Светлагорску на вуліцы Лазо, што ў мікрараёне Светач, быў цалкам заменены верхні слой асфальтабетоннага пакрыцця. Выкананы і ямачны рамонт на ўчастку праезнай часткі каля 9-й школы ў Светлагорску.

— Чакаем, што зменіцца сітуацыя з дарогай і ў Прудку, — спадзяецца Валянціна Шарыпава.

Як высветлілася, вуліца Школьная ў аграгарадку Прудок забудоўвалася ў пачатку 1970-х гадоў. Грунтавая дарога тут згаданага перыяду. Раз у год яе праходзяць грэйдарам, але ў міжсезонне, у дажджлівыя дні дабрацца некуды па Школьнай — тое яшчэ выпрабаванне. А між тым па вуліцы, дзе якраз размешчана Прудкоўская школа, рух вельмі актыўны. Пасля агучвання дадзенай праблемы на асабістым прыёме ў Старшыні Савета Рэспублікі жыхары аграгарадка спадзяюцца, што дарогу заасфальтуюць.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

АД ПРЫВАТНАГА ДА АГУЛЬНАГА

ВЫЯЗНЫЯ прыёмы грамадзян, якія праводзяць члены Савета Рэспублікі, — магчымасць эфектыўна вырашыць асабістыя і калектыўныя пытанні ў кароткія тэрміны, калі на мясцовым узроўні тое немагчыма. Работа з насельніцтвам — адзін з галоўных напрамкаў дзейнасці верхняй палаты парламента, прычым работа вядзецца не дзеля фармальнасці, а на вынік. А ён ёсць пасля кожнага прыёму. У Віцебску мы сабралі гісторыі людзей, якім сенатары працягнулі рэальную руку дапамогі.

«Такія прыёмы павінны праводзіцца часцей»

На адзін з такіх прыёмаў у ліпені да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай прыйшла жыхарка Віцебска Зоя Ячменева. Яе муж, украінец, звыш 30 гадоў жыве ў Беларусі і дасюль ніяк не мог атрымаць грамадзянства. Неабходныя дакументы розныя інстанцыі перакідвалі з аднаго месца ў іншае на працягу доўгіх гадоў. З просьбай аб дапамозе ў атрыманні грамадзянства Зоя Пятроўна звярнулася да Наталлі Іванаўны, і справа пайшла хутчэй: дакументы прынялі ў разгляд са станоўчым вынікам.

> Такія формы работы з насельніцтвам, як прыёмы грамадзян, павінны праводзіцца як мага часцей. На першы погляд можа здавацца, што зварот да вышэйшай улады — справа недасягальная, але калі астатнія інстанцыі проста разводзяць рукамі, надзея застаецца толькі на яго. Гэта сапраўды вялікая дапамога, а не проста фармальнасць. І важна, каб цябе выслухалі не толькі па канкрэтным пытанні, бо ўсё, як атрымліваецца, можна вырашыць».

У Зоі Ячменевай падчас прыёму вырашылася яшчэ адна праблема. Справа ў тым, што маладая маці з'яўляецца інвалідам другой групы і з-за абмежаванняў па здароўі пасля выхаду з дэкрэтнага водпуску доўгі час не магла знайсці работу. Яна скончыла ВДУ і атрымала спецыяльнасць «Бібліятэкар-бібліёграф», нарадзіла дачку Софію, і праз тры гады не змагла знайсці рабочае месца нават па такім «спакойным» профілі. Тым больш што з-за стану здароўя ёй было дазволена афармленне толькі на 0,5 стаўкі.

Падчас размовы са Старшынёй Савета Рэспублікі жанчына коратка апісала сваю сітуацыю, і ўжо праз месяц заняла пасаду бібліятэкара ў бібліятэцы імя Янкі Купалы. Праз гарвыканкам Зоі Пятроўне знайшлі неабходныя 0,5 стаўкі, і цяпер маладая маці працуе на чатыры гадзіны на дзень. Няшмат, але гэта добрая фінансавая падтрымка, а яшчэ — магчымасць займацца любімай справай у добрым калектыве.

«Такія формы работы з насельніцтвам, як прыёмы грамадзян, павінны праводзіцца як мага часцей. На першы погляд можа здавацца, што зварот да вышэйшай улады — справа недасягальная, але калі астатнія інстанцыі проста разводзяць рукамі, надзея застаецца толькі на яго. Гэта сапраўды вялікая дапамога, а не проста фармальнасць. І важна, каб цябе выслухалі не толькі па канкрэтным пытанні, бо ўсё, як атрымліваецца, можна вырашыць», — падзялілася з намі Зоя Пятроўна.

«Вырашылася праблема ўсіх дзяцей на маім асабістым прыкладзе»

Асабістую гісторыю, звязаную з майскім прыёмам у Наталлі Качанавай, захоўвае і Наталля Маркевіч. Яна звярнулася да старшыні з просьбай рэгулявання адукацыйнага працэсу для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі і вырашыла праблему многіх бацькоў Беларусі.

Наталля Маркевіч дабілася палёгкі ў навучанні не толькі для дачкі Маргарыты, але і для іншых дзяцей.

Дачка Наталлі Віктараўны Маргарыта наведвае школу нумар 44 горада Віцебска. Дзяўчынка мае праблемы з апорна-рухальным апаратам і каардынацыяй, але, як і ўсе школьнікі, асвойвае агульна-адукацыйную праграму. Цяпер яна вучыцца ў восьмым класе, па выніках мінулага года мае сярэдні бал 7,5. Але з-за стану здароўя не можа займацца на ўроках фізічнай культуры, працоўнага навучання і медыцынскай падрыхтоўкі. І калі з першым прадметам пытанне было вырашана вызваленнем ад заняткаў, то з іншымі — не.

Як расказвае Наталля Віктараўна, дачцэ фізічна цяжка вышываць, выразаць з тканіны — увогуле ўсё, што датычыцца мелкай маторыкі. На просьбу маці аб вырашэнні дадзенай праблемы шляхам вызвалення ад заняткаў у паліклініцы разводзілі рукамі. Жанчына вусна звярталася нават у Міністэрства адукацыі і аховы здароўя, але і там адказвалі, што афіцыйнай падставы — дакумента — для гэтага няма. На ўроках працоўнага навучання Маргарыта прысутнічала, атрымлівала заданні на дом, якія рабіла маці, каб атрымаць атэстацыю па прадмеце. Педагагічны калектыў ставіўся да іх сітуацыі з разуменнем і без негатыву, адзначае Наталля Маркевіч.

Пасля шматлікіх безвыніковых зваротаў у інстанцыі маці вырашыла запісацца на прыём да Наталлі Качанавай, хоць сям'я не спадзявалася на станоўчы вынік размовы. Пасля звароту да Старшыні Савета Рэспублікі згаданае пытанне было разгледжана, і ўжо 1 верасня 2022 года ўступіла ў сілу Пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2022 года нумар 76 «Аб пераліку захворванняў, якія з'яўляюцца медыцынскай падставай для вызвалення навучэнцаў ад вывучэння асобных навучальных прадметаў».

> Пасля шматлікіх безвыніковых зваротаў у інстанцыі маці вырашыла запісацца на прыём да Наталлі Качанавай, хоць сям'я не спадзявалася на станоўчы вынік размовы. Пасля звароту да Старшыні Савета Рэспублікі згаданае пытанне было разгледжана, і ўжо 1 верасня 2022 года ўступіла ў сілу Пастанова Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 2022 года нумар 76 «Аб пераліку захворванняў, якія з'яўляюцца медыцынскай падставай для вызвалення навучэнцаў ад вывучэння асобных навучальных прадметаў».

«Калі я прыйшла на прыём, адразу сказала, што маё пытанне датычыцца ўсіх дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Гэта было праблемай цэлай краіны, якая, нарэшце, вырашылася. Пасля прыёму справа пайшла лепш, сталі званіць з нашай паліклінікі, аддзела па адукацыі і школы. Калісьці Наталля Іванаўна гаварыла, што важнай часткай узаемадзеяння з насельніцтвам з'яўляецца зваротная сувязь, сапраўды, гэта паказчык таго, што цябе пачулі. Толькі ў нашым горадзе я знаёмая з бацькамі чатырох дзетак з такімі ж праблемамі, а пасля першага верасня, калі выйшла пастанова, мне тэлефанавала знаёмая з Брэста і дзякавала. Такія прыёмы жыццёва неабходныя, і, як выйшла, на кожным асабістым прыкладзе можна вырашыць агульную для многіх праблему», — адзначыла Наталля Маркевіч.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

НЕПРАВІНЦЫЯ

ФАРБЫ ШАРАШЭЎСКАЙ ВОСЕНІ

Кірмашы па продажы сельгаспрадукцыі праходзяць не толькі ў вялікіх гарадах і райцэнтрах, але і ў аграгарадках

У Брэсцкай вобласці гэтай восенню запланавана правесці больш за сто сельскагаспадарчых кірмашоў. Першы такі прайшоў у абласным цэнтры ў мінулую суботу. Старшыня гарвыканкама Аляксандр Рагачук у тэлеграм-канале прывёў параўнальную статыстыку па аб'ёмах продажу рознай прадукцыі і цэнах на яе — сёлета і летась. Дык вось аказалася, што цэны на некаторыя віды агародніны, садавіны былі крыху ніжэйшыя за мінулагоднія.

Прыкладна такая ж сітуацыя складвалася на кірмашах у Баранавічах, Кобрыне, Ганцавічах, іншых гарадах, дзе ўжо распачаты сезон асенніх продажаў. А як у вялікіх мястэчках, якія цяпер называюцца аграгарадкамі?

Старшыня Шарашэўскага сельскага Савета Пружанскага раёна Святлана АМЕЛЬЯНЕЦ расказала, што кірмашы ў Шарашэве праводзяцца ўжо некалькі гадоў запар. Як і ў даўнейшыя часы, гандляры размяшчаюць свой тавар на галоўнай плошчы пасёлка. Зранку сюды прыходзіць, а галоўным чынам прыязджае з навакольных вёсак шмат пакупнікоў. Зрабіць пэўныя запасы на зіму стараюцца многія гаспадары, напрыклад, пенсіянеры, якім не пад сілу апрацоўваць вялікія агароды. Для іншых наведвальнікаў гэты дзень выглядае нагодай купіць розную смакату і патрэбную ў гаспадарцы прадукцыю.

Нязменным попытам на сельскім кірмашы карыстаецца збожжа. Яго прывезлі гэтым разам два сельгаспрадпрыемствы раёна: ААТ «Мурава» і ААТ «Райаграсэрвіс». Пшаніцу, трыцікале, ячмень прадавалі ад 43 да 50 капеек за кілаграм. Усяго ў Шарашэва дзве гаспадаркі прывезлі 15 тон збажыны, фасаванай у мяшкі. За некалькі гадзін фактычна ўсё разышлося. Быў і камбікорм для жывёлы і птушкі. Яшчэ некалькі сельгаспрадпрыемстваў і адна фермерская гаспадарка прапанавалі агародніну. Бульба, буракі, морква, капуста — былі складзеныя ў мяхі-сеткі для зручнасці пакупніка. І людзі з задавальненнем куплялі дары восені. Хапала таксама груш, яблыкаў, журавін. Цэны ж выглядалі прымальнымі — нават крыху танней, чым у звычайныя дні на рынку. А тут, як той казаў, з дастаўкай у зручнае месца.

На кірмаш прыехалі жыхары вёсак не толькі Шарашэўскага, але і суседніх — Сухопальскага, Вялікасельскага сельсаветаў, недзе з паўсотні населеных пунктаў. Хто крыху прыпазніўся, не ведаў, дзе паставіць машыну. Добра, што супрацоўнікі ДАІ па просьбе мясцовай улады прысутнічалі, дапамагалі падтрымліваць парадак у справе паркавання і руху аўтатранспарту.

Паводле слоў кіраўніка сельвыканкама, людзі чакалі гэтага дня, рэкламы пра кірмаш у сацыяльных сетках хапала, ды і раённая газета напярэдадні паведаміла аб нагодзе прыехаць. Так што наведвальнікаў было шмат. Нават ранішні дождж не перашкодзіў добрай справе, праўда, потым ён здрабнеў і перастаў. А на імправізаванай сцэне тым часам праходзіў канцэрт. Самадзейныя артысты з Роўбіцкага, Мураўскага, Вялікасельскага і Шарашэўскага дамоў культуры стварылі прыўзняты настрой. Было мноства песень, танцаў, жартаў. Пад музыку і гандаль ішоў весялей. Спачатку работнікі кандытарскага цэха райспажыўтаварыства выказвалі пэўны скептыцызм з нагоды вялікай колькасці заказанай прадукцыі, а калі яе не засталося, былі прыемна здзіўленыя. Кааператары таксама гандлявалі мясам, іншымі харчовымі таварамі. Добрым попытам карысталіся паўфабрыкаты мяснога цэха ААТ «Журавлінае».

Была і жывая рыба ад прадпрымальнікаў, прадавалі саджанцы пладовых і дэкаратыўных дрэў, самыя розныя кветкі. Яшчэ, што асабліва каштоўнае ў такіх кірмашах, паводле ацэнкі Святланы Амельянец, прадаць прадукцыю маглі не толькі прадпрыемствы розных формаў уласнасці, але і самі гаспадары, у каго ёсць лішкі. Бабулькі-пенсіянеркі прадавалі часнок са сваіх агародаў, і пакупнікоў не бракавала.

— Ва ўсім адчувалася атмасфера кірмашу, — гаворыць кіраўнік мясцовай улады. — Летась з-за кавідных абмежаванняў мы не маглі арганізаваць канцэрт, наогул было менш удзельнікаў, а цяпер людзі з задавальненнем ішлі сюды, сустракалі знаёмых, рабілі пакупкі.

У наступныя выхадныя такі ж кірмаш пройдзе ў Ружанах, а яшчэ праз тыдзень у райцэнтры адбудзецца традыцыйны фэст асенніх продажаў «Пружанская восень».

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

НА ЛАЎЦЫ З ВЯДОМАЙ ЗЯМЛЯЧКАЙ

Як грамадзянская ініцыятыва паспрыяла захаванню крыніцы і памяці

